ЦЕНТРАЛЬНАЯ ГАЗЕТА

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

Цэны падпіскі (з дармовым дадаткам „Прафрух“): На 1 мес. — 90 к. • 3 мес. 2 р. 60 к. • 6 мес. 5 р. — • 12 мес. 9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. ўдадатку.

Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэкцтар 13-80
Сэкцтар інфармацыі 13-80
Начны рэдактар 6-42
Галоўная кантора 7-81
Аддзел падпіскі 7-81
„ абвестак 7-81

АУТОРАК 18 сакавіка 1930 г. № 65 (3573) Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЛЕНІНСКАГА КАМІНТЭРНУ

МІЖНАРОДНЫ ПРАЛЕТАРЫЯТ ПРАЦЯГВАЕ СПРАВУ ПАРЫСКАЕ КАМУНЫ

Ад Парыскай—да сусьветнай Камуны

59 год таму назад парыскія рабочыя паднялі гэраічнае паўстаньне супроць буржуазіі. Два з лішнім месяцы ўвесь сьвет затаіўшы дыханьне сачыў за гэтай схваткай, у якой нявольнікі капіталу ўпяршыню вырвалі з рук клясавага ворага яго найбольш магутную зброю—дзяржаўную ўладу.

Парыская Камуна існавала 72 дні і была патоплена ў моры пралетарскай крыві крывавымі псамі буржуазіі.

Ужо 13 год вочы пралетарыяту, працоўных, прыгнечаных народаў усяго сьвету прыкаваны да Савецкага Саюзу, да краю пераможнай пралетарскай рэвалюцыі і пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва.

Дзякуючы таму, што пралетарыят Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам свае ленінскае камуністычнае партыі, улічыў той багаты вопыт Парыскай Камуны. Савецкі Саюз ажыцьцяўляе зараз вялікія ідэі, за якія змагаліся парыскія камунары.

Вялікія працэсы адбываюцца ў Савецкім Саюзе. У жорсткай клясавай барацьбе ідзе выкарчоўваньне карэньняў капіталізму. Вялізарны рух шырокіх бяднацка - серадняцкіх мас у калгасы, за сацыялізм — стварае магчымасьць калектывізаваць у асноўным сельскую гаспадарку Савецкага Саюзу ў працягу 2-3 гадоў. На базе суцэльнай калектывізацыі ідзе ліквідацыя апошняй капіталістычнай клясы — кулацтва.

«Грымоты парыскіх гармат разбудзілі самыя адсталыя пласты пралетарыяту і ўсюды далі штуршок да ўзмацненьня рэвалюцыйна - сацыялістычнай прапаганды. Вось чаму справа Камуны не памерла; яна да гэтага часу жыве ў кожным з нас» (Ленін).

Кастрычнікавая рэвалюцыя, пасьпяховае ажыцьцяўленьне пяцігадовага плану, пераможнае сацыялістычнае наступленьне ў шмат разоў больш, чым гарматы парыскіх камунараў разбудзілі, будзяць і будуць будзіць да барацьбы шырокія калены працоўных усяго сьвету.

Наступленьне пралетарыяту Савецкага Саюзу на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі супадае з магутнай хваляй рэвалюцыйнай барацьбы сусьветнага пралетарыяту ў капіталістычных краёх. Ліквідацыя кулацтва, як клясы, у СССР выклікае новы ўздым энтузіязму працоўных усяго сьвету, узмацняе волю да барацьбы ў іх.

Выступленьні пралетарыяту ў дзень 6-га сакавіка, у дзень міжнароднага Чырвонага дня барацьбы з беспрацоўем — аж занадта выразна сьведчаць аб тэй новай ступені, на якую зараз падымаецца рэвалюцыйны ўздым. У гэты дзень мы мелі крывавыя бойкі рабочых з паліцыяй у цэлым радзе краёў, барыкады ў Вэдынгу, крывавыя баі ў Празе, Дэтройце і г. д. Сотні тысяч пралетараў выйшлі на вуліцу на заклік камуністычнай партыі.

Мы маем таксама магутны рэвалюцыйны ўздым у прыгнечаных імпэрыялізмам калёніях. Толькі за апошнія некалькі месяцаў мы мелі паўстаньне ў Філіпінах, у Інда-Кітаі. Узмацняецца рэвалюцыйная барацьба рабочых і сялян у Кітаі, павялічваецца кітайская Чырвоная армія, якая займае ўжо шмат гарадоў і вёсак Кітаю, і зьяўляецца сапраўдным чырвоным пужалам для капіталістых і памешчыкаў.

Савецкі Саюз зьяўляецца сапраўднай зоркай, на якую накіраваны погляды працоўных усяго сьвету.

Крывавыя Т'еры міжнароднай буржуазіі прабуюць у патоках крыві задушыць узрастаючы рэвалюцыйны ўздым. Толькі за апошнія 7 год кінута ў засьценкі капіталу 400.000 рабочых і сялян; за апошнія 9 месяцаў у буржуазных краёх забіта 89.000 чал. Але ня ўдасца Т'ерам задушыць рэвалюцыйны ўздым, ня ўдасца затрымаць пёкаматыў рэвалюцыі, які задушыць іх сваімі калёсамі.

Крывавыя Т'еры працягваюць свае рукі да Савецкай Камуны, у якой яны бачаць крыніцу ўсіх сваіх бед, крыніцу ўсіх паўстаньняў, крыніцу развалу капіталізму. Супроць Савецкага Саюзу мабілізуюцца ўсе чорныя сілы сусьветнай буржуазіі. Да барацьбы з чырвонай зданьню паднялася ўся чорная зграя, пачынаючы ад сацыял - фашыстых і канчаючы рымскім папай.

У дзень 18-га сакавіка сусьветны пралетарыят у адказ на правакацыі сусьветных імпэрыялістых яшчэ больш узмацніць сваю барацьбу за абарону СССР. Рабочая кляса Савецкага Саюзу ў гэты дзень яшчэ больш узмацніць сваю энэргію для таго, каб падрыхтавацца даць адпор сусьветнаму імпэрыялізму, калі ён адважыцца сілай задушыць Савецкую Камуну.

У дзень 18-га сакавіка, які зьяўляецца днём памяці Парыскай Камуны і днём міжнароднай арганізацыі дапамогі змагаром рэвалюцыі, кожны сьвядомы рабочы, кожны працоўны селянін павінен выступіць з актыўнай дапамогай тым, якія прымаюць на сябе першыя ўдары разьюшанага клясавага ворага, каб забясьпечыць чырвоны тыл міжнароднай рэвалюцыі.

Парыская Камуна была першым узорам ажыцьцяўленьня дыктатуры пралетарыяту.

Ажыцьцяўленьне ідэй Камуны ва ўсім сьвеце, пабудова сусьветнай Камуны — вось шлях, па якім ідзе міжнародны пралетарыят.

Украінская контр-рэвалюцыя перад пралетарскім судом

ХАРКАЎ, 17. На працэсе «СВУ» Яфрэмаў на пытаньне пракурора аб матывах выкліку Нікоўскага на Украіну, пацьвердзіў, што прыезд Нікоўскага быў часткай агульнага пляну, разьлічанага на заснаваньне контр - рэвалюцыйнай арганізацыі. Нікоўскі на пытаньні, якія яму задае пракурор, прызнае, што перад яго ад'ездам у Бэрлінэ адбылася канфэрэнцыя кіраўнікоў украінскіх эмігрантаў, на якой вяліся размовы з прадстаўнікамі гэтманскіх колаў. Нікоўскі атрымаў пэўныя паказаньні адносна ўвязкі дзейнасьці пятлюраўскае эміграцыі з рэшткамі пятлюраўшчыны на Савецкай Украіне. Устаноўка на бэрлінскай канфэрэнцыі была такая: «Разгарнуць на Савецкай Украіне контр - рэвалюцыйную дзейнасьць, скінуць савецкую ўладу шляхам паўстаньня і стварыць з яе, як гаворыць Нікоўскі, нармальны тып эўрапэйскай дзяржавы — дэмакратычную рэспубліку».

Такім чынам, Нікоўскі ехаў на Украіну з выразнай мэтаю праводзіць там контр - рэвалюцыйную дзейнасьць.

З далейшых запытаньняў грамадзкага абвінаваўцы т. Любчанкі высьвятляецца, што партыя сацыялістых-фэдралістых адносілася да нямецкае акупацыі Украіны, як да «уступленьня прыяцельскага войска». На пытаньне Любчанкі, як Нікоўскі ацэньвае варшаўскі дагавор Пятлюры з Пілсудзкім, Нікоўскі адказвае: Гэта скандальны ганебны дакумант».

Тады Любчанка агалашае вытрымку з агляду дзейнасьці «Міністэрства замежных спраў УНР» за верасень 1920 году, дзе Нікоўскі дае вусім іншую ацэнку варшаўскаму дагавору. У дакуманце гаворыцца: «Пасьля высьвятленьня міжнароднага становішча УНР разгарнулася на канфэрэнцыі шырокая дыскусія, паміж іншым адносна польска-украінскага дагавору. Абмеркаваўшы падрабязна адмоўныя і станоўчыя бакі дагавору, канфэрэнцыя агадзілася в тым, што такі саюз для УНР быў неабходным, ён даў нам яшчэ адно прызнаньне дзяржавы, якая існуе і будзе існаваць, што ён адчыніў нам доступ да заходніх дзяржаў».

З далейшых запытаньняў высьвятляецца, што Нікоўскі быў ініцыятарам пераговараў УНР... з Японіяй аб пасяленьні пятлюраўцаў на Далёкім Усходзе. Нікоўскаму здавалася, што лягер пятлюраўцаў развальваецца і ён парашыў іх «выратаваць», даўшы ім магчымасьць працаваць і мець свой кавалак хлеба. Нікоўскі склаў такі плян: сабраць усіх пятлюраўцаў, вылучыць з іх групу каапэратараў, настаўнікаў, адміністратараў і адправіць іх на Далёкі Усход, які меркавала тады акупаваць японская армія. Пятлюраўцы павінны былі адыграць ролю «культуртрэгэраў» Прыморскай вобласьці, дзе ёсьць вялікая украінская калёнія і ў далейшым стварыць там якую - небудзь дзяржаўную арганізацыю пад пратэктарам Японіі. Перагаворы з Японіяй нечакана сарваліся, бо Японія дагаварылася з савецкім урадам і адмовілася ад акупацыі Уладывастоку і Прымор'я.

Адказваючы далей на пытаньне Любчанкі, Нікоўскі расказвае, як «СВУ» змагаўся за «незалежную Украіну». Старшыня украінскай дыплёматычнай місіі Швэйцарыі барон Васількоў падпісаў на бэрлінскай канфэрэнцыі дыплёматычны дакумант, з якога відаць, што УНР згаджаецца аддаць Заходнюю Украіну Польшчы, Бэсарабію і Букавіну —Румыніі, Закарпацкую Украіну — Чэха-Славакіі.

Далей, калі Нікоўскі расказаў аб стварэньні філіі «СВУ» у Адэсе, паміж іншым, ён прызнаўся ў размове са Слабчэнка (таксама абвінавачаны па гэтай справе), што ён усхваляў фашызм, як дзяржаўную сыстэму, якая аздаравіла Італію. Відавочна, гаворыць Нікоўскі, што пляцформа фашызму мела многа агульнага з тымі маімі настроямі, якія я тады ў сабе аформіў і якія былі сярод украінскай часткі інтэлігэнцыі ў Кіеве.

Тав. Любчанка асьвятляе ў апошні момант праграму «СВУ». На пытаньне Любчанкі, ці прадугледжвала праграма «СВУ» устанаўленьне ўласнасьці на зямлю, зварот фабрык і заводаў капіталістым, Нікоўскі адказвае станоўча.

На пытаньне Любчанкі, ці не паказваюць усе агалошаныя дакументы, што гэта зусім не падобна на незалежнасьць.

Нікоўскі адказвае: «Калі да гэтага дадаць, што былі яшчэ дакументы, якія тут ня былі агалошаны, напрыклад, па справе Бальтыцка - Чорнаморскага саюзу, перагаворы і дагавор з Савінкавым, Кубанскай радаю, дык вашы вывады робяцца яшчэ больш сумнымі. Гэта была барацьба не за незалежную Украіну, гэта быў шлях, які павінен быў прывесьці да яе прыгнечаньня».

Любчанка падагульвае: Такім чынам арганізацыя, якая сядзіць цяпер на лаўцы падсудных, створаная на асновах УНР, яе традыцыях, па сутнасьці працягвала праграму барацьбы супроць рабочых і сялян за фактычнае прыгнечаньне, за аддачу Украіны пад уплыў замежнага капіталу. Нікоўскі: «Так, гэта арганізацыя трапіла на такі шлях».

На гэтым канчаецца допыт Нікоўскага грамадзкім абвінавачаньнем.

Бунт навабранцаў у Польшчы

Пратэст супроць падрыхтоўкі нападу на СССР

У ўчарайшым нумары «Сав. Беларусі» паведамлялася аб бунце 300 навабранцаў, якія ехалі з Варшавы ў віленскія палкі.

Дэманстранты выступалі на ўсіх вялікіх станцыях, дзе спыняецца поезд, супроць падрыхтоўкі фашысцкім урадам ваенных авантур, у прыватнасьці супроць падрыхтоўкі нападу на СССР.

Вялікі мітынг адбыўся на ст. Беластон, дзе паліцыя не магла даць рады навабранцам. Мітынг адбыўся таксама ў Горадні. Нарэшце ўлада рашыла расправіцца з дэманстрантамі і выслала на ст. Араны перад прыходам цягнікі шмат войска з корпусу пагранічнай варты.

Станцыя Араны абярнулася ў вайсковы лягер, былі пастаўлены з абодвых бакоў пэрону кулямёты.

Як толькі прышоў цягнік, дык жандармэрыя з вінтоўкамі напагатове накінулася на вагоны, у якіх ехалі навабранцы. Апошнія пачалі ўпарта і разьюшча абараняцца ад войска, жандармэрыі і паліцыі, прычым павыбівалі ўсе шыбы ў вагонах, паламалі лаўкі, пазастаўлялі праходы куфэркамі, каб загарадзіцца ад наступаючых. Пасьля ўпартай бойкі, жандармэрыі, войску і паліцыі ўдалося захапіць адзін вагон з навабранцамі. 37 чалавек арыштавана, закута па руках і нагах кайданамі і адвезена ў вастрог. 300 чалавек пад узмоцненай вартай жандармэрыі, якая абкружыла навабранцаў, дастаўлена ў Вільню.

У Беластоку выступленьне навабранцаў абярнулася ў вялікую дэманстрацыю пратэсту супроць нападу на СССР, прычым сутычкі з паліцыяй дайшлі да крывавых боек: паліцыя і жандармэрыя страляілі ў навабранцаў.

Дакладных вестак аб колькасьці забітых і параненых пакуль што няма. Газэты-ж паведамляюць, што пры сутычцы была ўжыта агнястрэльная зброя.

Гром парыскіх гармат разбудзіў самыя адсталыя пласты пралетарыяту і ўсюды даў штуршок да ўзмацненьня рэвалюцыйна-сацыялістычнае прапаганды. Вось чаму справа Камуны не памерла; яна да гэтага часу жыве ў кожным з нас.

ЛЕНІН.

Першы вопыт пралетарскай дыктатуры

Карл Маркс сказаў: «Гісторыя ўсяго папярэдняга грамадзтва ёсьць гісторыя барацьбы клясаў».

Але ў гэтай гісторыі чалавецтва бываюць моманты, калі клясавая барацьба дасягае свайго апагею, свайго вышэйшага разьвіцьця і тады кляса прыгнечаная, прыдушаная, закабаленая раптам горда выпростае сваю вякамі згорбленую сьпіну, адважна скідае цяжкае ганебнае ярмо, якое прыгінала яе нізка.

Такім момантам вышэйшага рэвалюцыйнага гэраізму ў клясавай барацьбе пралетарыяту і была Парыская Камуна 1871 году.

Парыская Камуна сваім слаўным узьнікненьнем, гэраічнай самаадданай барацьбой і трагічнай пагібелю ўпісала найбольш яскравую і вялікую старонку ў гісторыі вызваленчае барацьбы рабочае клясы.

Чытаючы і вывучаючы гэту гэраічную старонку мінулага, мы зьвязваем яго з сучасным, з тэй рэчаіснасьцю і з тэй канкрэтнай абстаноўкай, якая акружае нас, якімі мы жывем у даны гістарычны момант. І гэта сувязь павінна быць такой, якая-б учыла нас, што ўрокі мінулага не прапалі для нас даремна, не засталіся голымі тэарытычнымі вывадамі, але былі-бы ператвораны ў цела і кроў рэальнага жыцьця, былі-б скарыстаны ў нашай барацьбе, у нашым будаўніцтве новых вышэйшых грамадзкіх форм.

Дасканалы ўзор такога падыходу да Парыскае Камуны дае нам Уладзімер Ільліч Ленін. І ў рэвалюцыю 1905 г., і ў рэвалюцыю 1917 году ён шырока карыстаецца прыкладам, практыкай і ўрокамі Парыскай Камуны.

Парыская Камуна, ня гледзячы на сваё паражэньне, ня гледзячы на 72-хдзённае панаваньне парыскіх рабочых пакінула сусьветнаму рабочаму руху такую багатую, нязьнікаючую скарбніцу рэвалюцыйнага вопыту, з якой яшчэ доўга будзе чэрпаць сусьветны пралетарыят.

У прадмове да Марксавай «Грамадзянскай вайны ва Францыі» Энгельс піша: «У апошні час філісьцер зноў пачаў выяўляць жах пры словах: дыктатура пралетарыяту. Ці хочаце ведаць, шаноўныя паны, што такое гэтая дыктатура? Узірнецеся ў Парыскую Камуну. Гэта была дыктатура пралетарыяту».

На падставе глыбокага вывучэньня ўрокаў Парыскай Камуны і ўліку яе практыкі канчаткова склаліся і афарміліся асноўныя прынцыпы тэорыі Маркса аб сацыяльнай рэвалюцыі і дыктатуры пралетарыяту. Практыка яе лягла таксама ў аснову рэвалюцыйнай тактыкі бальшавізму, у аснову стратэгіі тактыкі першай пралетарскай рэвалюцыі і пабудаваньня першае пралетарскае дзяржавы. Вялікі будаўнічы пралетарскай рэвалюцыі тав. Ленін ня раз падкрэсьліваў, што «Камуна навучыла эўрапэйскі пралетарыят канкрэтна ставіць задачы сацыяльнай рэвалюцыі», што Камуна была першым крокам разьвіцьця пралетарыяту, прадобразам савецкае ўлады.

Рабочыя Парыжу, ня гледзячы на ўсю сваю самаадданасьць, на ўвесь свой гэраізм, не маглі ўтрымаць у сваіх руках захваченую імі ўладу. У жорсткіх бойках майскага крывавага тыдню, яны пацярпелі найвялікшае паражэньне. Гэта паражэньне тлумачаць аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі прычынамі. Аб'ектыўнай прычынай зьяўляецца невыстарчальнае разьвіцьцё эканамічных адносін для магчымасьці ажыцьцяўленьня пераможнай пралетарскай рэвалюцыі. Суб'ектыўная прычына ляжыць у тым, што парыскі пралетарыят аказаўся арганізацыйна і ідэалёгічна непадрыхтаваным да насьпеўшых гістарычных падзей.

Рэвалюцыя 18-га сакавіка не зьяўлялася вынікам сыстэматычнай і плянавай падрыхтоўкі з боку рабочых арганізацый, якія існавалі ў Парыжы. Яна была стыхійным рэвалюцыйным выбухам. Не знайшлося ні аднэй рэвалюцыйнай рабочай арганізацыі, якая здолела-б ператварыць рэвалюцыйную псыхалёгію мас у рэвалюцыйную сьвядомасьць і рэвалюцыйныя дзеяньні, якая здолела-б арганізаваць стыхійны рух і накіраваць яго да пэўнай і сьвядомай мэты.

Адсюль памылка ЦК Нацыянальнай гвардыі, які ўпусьціў дасканалы момант рэвалюцыйнай сытуацыі 18-га сакавіка, каб канчаткова разьбіць свайго ворага. Адсюль палітыка нерашучасьці і хістаньняў самой Камуны. І адсюль, з гэтага ўроку Камуны, міжнародны пралетарыят ясна зразумеў, што бяз моцных, маналітных палітычных арганізацый ён заўсёды будзе разьбіты ў барацьбе з буржуазіяй.

Камуна паказала, што пралетарыят, пачынаючы з дадай стадыі разьвіцьця капіталізму, зьяўляецца адзінай рэвалюцыйнай клясай, здольнай узяць на сябе абарону інтарэсаў усяе прыгнечанае і эксплёатаванае масы, што ён—«адзіная кляса, здольная да грамадзкай ініцыятывы» (Маркс).

Камуна яскравым прыкладам паводзін францускай буржуазіі «расьсеяла —паводле слоў Леніна—патрыятычныя ілюзіі і разьбіла наіўную веру ў агульна-нацыянальныя імкненьні буржуазіі». Буржуазія ішла на самы цяжкі ганебны мір, яе правадыр Т'ер гатоў быў лізаць боты ў Бісмарка, каб толькі мець магчымасьць расправіцца са сваім клясавым ворагам у асобе парыскіх камунараў.

Практыка ўзброенага змаганьня і самых жорсткіх крывавых баёў Камуны сваёй неабвержнай лёгікай рэчаў ясна паказала сусьветнаму пралетарыяту, «што клясавае змаганьне пры поўных умовах вылізваецца ў форму ўзброенай барацьбы грамадзянскай вайны, што бываюць моманты, калі інтарэсы пралетарыяту патрабуюць бязьлітаснага зьнішчэньня ворагаў у адкрытых схватках» (Ленін). Тут церпіць поўнае крушэньне тактыка, разьлічаная на мірнае вырашэньне клясавых супярэчнасьцяй у капіталістычным грамадзтве.

Але вялікае сусьветна-гістарычнае значэньне Парыскай Камуны заключаецца ў тым, што «яна—паводле слоў Маркса—па існасьці сваёй была ўрадам рабочае клясы, вынікам барацьбы паміж клясай, якая выробляе, і клясай, якая прысвойвае, тэй даўно шуканай формай, у якой магло-б адбыцца эканамічнае вызваленьне працы». У гэтым Маркс бачыў вялікія заваяваньні, вялікі прыклад Камуны. Ленін бачыў у Камуне вышэйшы тып дэмакратычнае дзяржавы, якая ўзьнікла замест ламанай буржуазнай дзяржаўнай машыны. Ён лічыў, што «саветы аднаўляюць (воспроизводят) той тып дзяржавы, які выпрацаваўся Парыскай Камунай», «што савецкая ўлада ёсьць другі сусьветна-гістарычны крок або этап разьвіцьця дыктатуры пралетарыяту. Першым крокам была Парыская Камуна». Праз савецкую ўладу ў нашым Саюзе Парыская Камуна набывае такім чынам дзейснае сусьветнае значэньне, бо «савецкая ўлада перастала быць расійскай формай улады пралетарыяту, яна стала пазыцыяй міжнароднага пралетарыяту ў яго барацьбе за ўладу, яна зрабілася другім крокам ва сусьветным разьвіцьці сацыялістычнай рэвалюцыі. Першым крокам была Парыская Камуна, якая паказала, што яна вядзе да сацыялізму рабочую клясу ня інакш, як праз дыктатуру, праз гвалтоўнае прыдушэньне эксплёататараў» (Ленін).

Вось чаму буржуазія, якая з такою зьвярынаю лютасьцю расправілася з Парыскай Камунай, цяпер усю сваю нянавісьць, злость і жывёліны страх пераносіць і на СССР, які сваімростам, разьвіцьцём і ўмацаваньнем пагражае ёй у непараўнальна большай меры, чым Парыская Камуна.

Вось чаму ўсе служкі капіталу, пачынаючы ад сацыял-фашыстых і канчаючы папай рымскім выліваюць брудныя памыі гнюснага паклёпу на наш Савецкі край і рыхтуюць супроць яго свой крыжовы паход.

Вось чаму сусьветны пралетарыят вы ступае супроць наступаючага на працу капіталу, не забывае, што яго перамога цесна зьвязана з перамогаю нашага Саюзу і гучна заяўляе: «рукі прэч ад нашага сацыялістычнага будаўніцтва».

С. Р.

МОПР на Беларусі

Ажыцьцяўленьне ідэй Парыскай Камуны можа быць дасягнута толькі пры актыўнай дапамозе пралетарыяту і рэвалюцыйнага сялянства ўсяго сьвету. Клясавая пралетарская салідарнасьць знайшла сваё канкрэтнае выяўленьне ў тым, што да 59-ай гадавіны Парыскай Камуны больш за 250.000 рабочых і працоўных сялян БССР праз МОПР прымаюць актыўны ўдзел у вялікай справе матар'яльнай і маральнай дапамогі барацьбітом рэвалюцыі.

На белы тэрор сусьветных фашыстых, які набыў за апошні час нячуваныя разьмеры, працоўныя Беларусі адказваюць узмацненьнем матар'яльнае дапамогі, аб чым сьведчаць наступныя лічбы: у 1928 г. сабрана 148.042 руб., у 1929 г.—278.622 руб.

МОПР, як грамадзка-палітычная арганізацыя, не абмяжоўваецца толькі зьбіраньнем матар'яльнай дапамогі палітзьняволеным, але і прымае актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве. У 1929 годзе мопраўцамі БССР закуплена аблігацый дзяржаўных пазык на 11.000 руб. у карысьць палітзьняволеных падшэфных турмаў. Мопраўскія трыеры ачышчаюць насеньне ў раёнах суцэльнае калектывізацыі. Дзесяткі моп раўскіх калгасаў арганізаваны ў БССР за апошні час. Мопраўскія брыгады зараз працуюць у галіне калектывізацыі і веснавой пасеўнай кампаніі.

У дзень Парыскай Камуны і дня МОПР'у нам асабліва неабходна завастрыць увагу ўсіх мопраўскіх арганізацый на ўзмацненьні нашай практычнай работы. У гэты дзень МОПР павінен праверыць сваю гатоўнасьць і здольнасьць падняць на належную вышыню інтэрнацыянальнае выхаваньне мас у духу баявога інтэрнацыяналізму. Уся ўвага мопраўцаў павінна быць накіравана на ўзмацненьне тэмпаў на ўдзеле у сацыялістычным будаўніцтве Савецкага краю і па пераводзе сваёй работы на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва.

У дзень Парыскай Камуны нашы баявыя лёзунгі: «Усе мопраўцы—на ўдарныя брыгады», «Мопраўцы—у калгасы, калгасьнікі—у МОПР», «Мопраўцы ў перадавых радох веснавой пасеўнай кампаніі».

ЛЕВІН.

Язэп Вазёрны

Камуне 71 году

Сакавік, як і сёньня, асьнежаны..
Тольні, хто тему сьнегу рад?
Успаміны мінулага—сьвежыя:
Камунары... і штурм барыкад..
«Жан!
Ты бачыш?
А я нічога...
Твае думкі, рабіць што цяпер:
Барыкаду штурмуе вораг...
Акрываўлены...
Чорны Т'ер!
Бачыш?
Сьмерць...
Надыходзіць бліжэй...
Што рабіцьмеш,
Таварыш Жан?
Кулі падаюць...
Так зямлю ніжуць...
Кулі...
Ах!..»
Зьнікнуў голас у даль...
«П'ер!
Таварыш!
Што сталася?
Ранен?
Я-жа думкі свае не сказаў!..»
Над Парыжам іскрылася раньне,
А у П'ера дачасна імгла...
І з Парыжу у гэткае раньне
Стогн ад залпаў ляцеў у даль...
— Муж забіты, і брат паранен...
Ў камунаркі бязьмерны жаль.

Помстай вочы у Жана гарэлі
Віўся сьцяг,...
Сьцяг сяброўскай крыві,
Над барыкадаю кулі рэялі...

Камунарам душой ня скрывіць.

І праменьнямі сонца сьмяецца:
— Перамога часовая вам,
Прыдзе час, шмат крыві праліецца!..—
Ў гэтым сёньня пакляўся Жан.

Хай сьвідруюць буржуі ад злосьці!
Хай іх вечары шаленствам гараць,
Яны ў Францыі толькі госьці!...

Хутка там загарыцца Зара!

Сакавік, як і сёньня, сьнежны
Дзень КАМУНЫ мы заўжды помнім

Дзень паўстанцаў, упартых, мяцежных...
А загінуўшым ставім помнік.

Вецер заклік у далі нясе
Па шырокім і вольным прасторам:
Republike Soviete Fle ranse Francuse
Хай жыве!
Чырвонымі зорамі!

Сакавік 1930 году.
г. Менск.

За інтэрнацыянальную пралетарскую салідарнасьць

У дзень 59-й гадавіны Парыскай Камуны асабліва важна адзначыць аб сучасным вялікім рэвалюцыйным уздыме пралетарыяту (забастовачны рух, міжнародны паход беспрацоўных) ва ўсіх буржуазных краінах.

Успомнім аб тых новых шматтысячных ахвярах буржуазнай эксплёатацыі, уціску і няволі ў Кітаі, Індыі, Амэрыцы, Нямеччыне і Польшчы. Успомнім аб крывавых баёх рэвалюцыйнага пралетарыяту на вуліцах Бэрліну, Гамбургу, Варшавы і Лодзі ў дні 1-га мая.

Успомнім аб тым, што за апошнія 7 год кінута ў засьценкі капіталу 400.000 рэвалюцыйных рабочых і сялян. Успомнім аб тым, што за апошнія 9 месяцаў у буржуазных краінах забіта і пакарана сьмерцю 89.000 чал.

Капіталістыя, фашысты і іх лёкаі сацыял-здрадзнікі распраўляюцца з рэвалюцыйнымі рабочымі яшчэ горш за вэрсальскіх катаў у дні Парыскай Камуны.

Але на дапамогу 100-тысячнай армії рэвалюцыянэраў, палітзьняволеных і іх сем'яў прыходзіць міжнародная арганізацыя дапамогі рэвалюцыянэрам (МОПР), якая налічвае ў сваіх радох у 48 сэкцыях каля 11 млн. членаў. У аднэй толькі сэкцыі Савецкага Саюзу налічваецца каля 4 млн. членаў МОПР'у.

Працоўныя Савецкага Саюзу заўсёды гатовы дапамагчы сваім братом і сёстрам. За 7 год мопраўцы СССР паслалі палітзьняволеным і іх сем'ям 5.549.370 руб., палітэмігрантам і іх сем'ям выдана 1.485.420 р.

Мопраўцы Савецкай Беларусі ідуць заўсёды наперад сваёй матар'яльнай і маральнай дапамогай палітзьняволеным і іх сем'ям. Аб гэтым сьведчаць буйны рост грашовых паступленьняў за апошнія гады. За 1929 год сабрана 260.000 руб. З кожным днём растуць рады МОПР'у. МОПР становіцца усё больш і больш папулярнай арганізацыяй.

Але перад усімі мопраўскімі арганізацыямі зараз паўстаюць вельмі важныя і адказныя задачы ў галіне разгортваньня працы па інтэрнацыянальным выхаваньні шырокіх працоўных мас, якія ахоплены МОПР'ам, і ў галіне штодзённага актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве Савецкага краю, ад гэтага залежыць рост аўтарытэту і папулярнасьць мопраўскай арганізацыі.

У дзень 59-й гадавіны Парыскай Камуны мопраўцы Савецкай Беларусі шлюць гарачае прывітаньне ўсіх працоўных, прыгнечаным народам і палітзьняволеным у буржуазных краінах і абяцаюць яшчэ больш актыўна дапамагаць у іх цяжкой барацьбе, а таксама яшчэ з большым тэмпам працягваць сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР—бацькаўшчыне міжнароднага пралетарыяту.

Ц.

Цікавае пачынаньне

ЛЕНІНГРАД. (Наш кар.). У Ленінградзе паложаны пачатак вельмі цікавай і добрай справе. Гутарка ідзе аб арганізацыі новага віду каапэрацыі, так званай культурна - бытовай каапэрацыі па выхаваньні дзяцей. Каапэрацыя гэта аб'ядная бацькоў, грамадзкія і іншыя арганізацыі, усіх тых, хто зацікаўлены ў найбольш лепшым, найбольш правільным выхаваньні нашага маладога пакаленьня.

Статут культурна - бытавое каапэрацыі прадугледжвае наступныя задачы: забесьпячэньне дзяцей дашкольнага ўзросту дзіцячымі пакоямі, арганізацыю дзіцячых пляцовак, садоў сквэраў, бібліятэк і чытальняў, спэцыяльных дзіцячых сталовых, наладжваньне летніх лягераў, правядзеньне экскурсій. Акрамя таго, у задачы каапэрацыі ўваходзіць масавая работа педагагічнага і санітарна - гігіенічнага характару. Каапэрацыя прымае жывейшы ўдзел ва ўсёй культурна - бытовай рабоце жаўтаў.

Сродкі свае культурна - бытавыя каапэратывы чарпаюць з угунных і паявых узносаў сваіх членаў. Бацькі, чые дзеці будуць выхоўвацца ва ўстановах каапэрацыі, будуць уносіць яшчэ асобую плату, якая бярэцца паводле заработку, вызначаецца агульным сходам пайшчыкаў.

Членамі культурна - бытавое каапэрацыі могуць быць усе працоўныя, а таксама ўстановы і арганізацыі, зацікаўленыя ў рабоце каапэрацыі. Мяркуецца таксама, што каапэрацыя зможа атрымаць і некаторыя бюджэтныя асыгнаваньні, а таксама будзе вышукваць сродкі шляхам арганізаньні лекцый, вечароў і г. д. Пытаньне аб арганізацыі культурна - бытавое каапэрацыі выклікала вялікую зацікаўленасьць сярод грамадзкасьці.

Наш адказ на крыжовы паход

Поўны правал антысавецкіх малебстваў у Англіі

ПРАПАНОВА «ДЫНАМАЎЦАЎ» УсеЦСПС і ВСНГ СССР

Рост сацыялізму ў краі пралетарскай дыктатуры — у краі сусьветнага пралетарыяту — выклікае шалёную нянавісьць з боку эксплёататараў і прыгнятальнікаў. Прафэсыянальныя эксплёататары нявуцтва, цемры, верныя саюзьнікі і агэнты капіталістых — папы ўсіх нацый — пад кіраўніцтвам «намесьніка хрыста» рымскага папы арганізуюць разам з генэральнымі штабамі капіталістычных армій, разам з усім капіталістымі крыжовы паход супроць СССР.

Пад мантыяй рымскага папы хаваецца шакал, які рыхтуецца мячом і агнём зьнішчыць так ненавісны ўсім ворагам рабочае клясы — ад каралёў нафты, магнатаў капіталу да сацыял - фашыстых — край будуючагася сацыялізму.

Мы чуем ужо лясканьне зубоў азьвярэўшых ненавісьнікаў сацыялізму, мы чуем ужо лязганьне зброяй золатапагонькінаў усіх краёў.

Лепшыя сыны рабочае клясы кідаюцца ў турмы, гінуць у падзямельлях ахранкі.

Капіталістыя робяць крывавую расправу над працоўнымі. Іх благаслаўляюць, ім дапамагаюць папы ўсіх нацый. Сам «намесьнік хрыста на зямле», папа рымскі, які днём і ноччу марыць аб разгроме пралетарскага краю, двудушна заклікае да абароны «хрысьціян» у СССР, якія, трэба сказаць, жывуць лепш, чым дзе-небудзь, якія карыстаюцца правамі большымі, чым дзе-небудзь на зямной кулі, калі яны працоўныя, а не крывапійцы, эксплёататары. Крывадушна ўзьнімаючы вочы к небу, папы ўсіх краёў укладваюць знарады ў жэрлы гармат, якія накіроўваюцца супроць краю, дзе ўладу трымае рабочая кляса.

Урад і пралетарыі нашага краю, якія цьвёрда праводзяць палітыку міра, на ўсе правакацыі падпальшчыкаў вайны адказвалі ўзмацненьнем барацьбы на працоўным фронце.

МЫ, РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ «ДЫНАМО», сёньня, калі ва ўсіх капіталістычных краёх азьвярэлыя ворагі кідаюць паклёп і нянавісьць на краіну саветаў у сваіх пропаведзях і набажэнствах на «гонимых христианах», заклікаем рабочую клясу нашага краю да вытрымаласьці і ўзмацненьня барацьбы за поўную перамогу сацыялізму пад сьцягамі выпрабаванай у жорсткіх баёх з клясавым ворагам бальшавіцкай партыі і правадыра сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі — КАМІНТЭРНУ.

У адказ на заклік рымскага папы да арганізацыі крыжовага паходу супроць СССР, у адказ на агідную антысавецкую кампанію — мы, рабочыя, заводу «Дынамо», заклікаем рабочую клясу нашага краю адказаць імпэрыялістым новым наборам ударных брыгад, больш шырокім разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва з тым, каб да 1-га мая пакрыць прарыў у выкананьні прамфінпляну.

За перавыкананьне прамфінпляну — за выкананьне пяцігодзі, сьцягу барацьбы за сацыялізм, у чатыры. Лепшы адказ нашым ворагам — узмацненьне абароназдольнасьці краю, узмацнен

Аб вялікадзяржаўным расійскім шавінізьме

27-га ліпеня 1929 г. «Зьвязда» ў перадавым артыкуле, прысьвечаным пытаньням барацьбы з нацыянал-апартуністычным ухілам унутры нашай партыі, зазначала на шкодлівасьць у абстаноўцы абвастрэньня клясавай барацьбы, у абстаноўцы ўзмацненьня сацыялістычнага наступленьня, актывізацыі ўсіх шавінізмаў, усіх нацыяналізмаў. Далейшыя падзеі поўнасьцю пацьвердзілі паказаны пункт погляду.

Цяпер, калі наша партыя ад палітыкі абмежаваньня і выцісканьня кулацтва зрабіла паварот да палітыкі яго ліквідацыі, як клясы, клясавая барацьба ў нашай краіне, натуральна, яшчэ больш абвастраецца, яшчэ больш актывізуецца клясавы вораг, яшчэ больш супраціўляецца ён на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і на фронце нацыянальнага будаўніцтва.

Разам з кулаком вядуць барацьбу супроць нашай палітыкі і непман, і буржуазны інтэлігент, і гандляр, і рэшткі старога чыноўніцтва. Гэта ўзрастаючае шалёнае супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі заўсёды знаходзіла і будзе знаходзіць сваё адлюстраваньне ў актывізацыі нацыяналізму.

Было-б вялізарнейшым апартунізмам думаць, што ўзмоцненая барацьба, якую правяла наша партыя з усякага роду нацыяналізмамі, зьняла з парадку дня небясьпеку далейшага ўзмацненьня гэтай барацьбы. КП(б)Б, выразна і ясна паставіўшы пытаньні рашучай барацьбы з нацыяналізмамі ўсіх колераў і з нацыянал-апартунізмам унутры нашай партыі, правільна падкрэсьліла асаблівую небясьпеку беларускага нацыянал-дэмакратызму, як ідэалёгічнае зброі беларускага кулацтва і беларускай буржуазіі ў барацьбе з пралетарскай дыктатурай. Ставячы так пытаньне, наша партыя, аднак ні на мінуту не дапускала хаця-б найменшага паслабленьня, або тым больш спыненьня барацьбы з іншымі шавінізмамі (вялікадзяржаўным рускім, яўрэйскім, польскім). У тэйжа перадавой «Зьвязды» ад 27 ліпеня ясна гаворыцца аб узрастаючай небясьпецы ўсіх нацыяналізмаў, аб необходнасьці ўзмацненьня з імі барацьбы, сканцэнтроўваючы на даным этапе асноўны ўдар на беларускі нацыянал-дэмакратызм і нацыянал-апартунізм. Партыя ніколі не забывала аб барацьбе з усімі шавінізмамі і ў тым ліку з вялікадзяржаўным расійскім нацыяналізмам, а таксама з усякага роду недаацэнкай нацыянальнага пытаньня і нацыянальных асаблівасьцей работы ў БССР, з нацыянальным нігілізмам, аб рашучай барацьбе за беларусізацыю.

Трэба, аднак, прызнаць, што рад зьяўленьняў нашай партыі гэту барацьбу не разгарнулі яшчэ даволі актыўна і шырока. Трэба падкрэсьліць, што ў радзе месц мы маем нават паслабленьне ўвагі да барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, са спробамі затармазіць або нават сарваць справу беларусізацыі, з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шавінізму і нацыянал-нігілістычных настрояў унутры асобных зьвенькаў партыі.

Вялікадзяржаўны расійскі шавінізм, як прылада клясавага ворага-непмана, расійскай, або русыфікаванай буржуазнай інтэлігенцыі, якая знаходзіць сабе падтрыманьне і спачуваньне з боку кулацка-непманскіх і нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў у РСФСР і інш. рэспубліках,—выступае супроць палітыкі нашай партыі і савецкай улады і ў прыватнасьці супроць нашай нацыянальнай палітыкі. Абвастрэньне клясавай барацьбы актывізуе вялікадзяржаўны расійскі шавінізм, хаця вельмі часта ён выступае ў глыбока завуаляванай форме. Вялікадзяржаўны шавінізм змагаецца за старое ўпрывілеяванае становішча «вялікарусаў», знаходзіць сваё выяўленьне ў нас ва ўзмацненьні барацьбы супроць індустрыяльна-калгаснага будаўніцтва ў БССР, якое разьбіває на справе рэшткі фактычнае нярэвалюцыйнасьці нацыянальнасьцей. Ён знаходзіць сваё выяўленьне ў адкрытым, а часьцей у скрытым зрыве беларусізацыі і карэнізацыі нашых апаратаў, у «кічліва-нагарных і бяздушна-бюракратычных адносінах расійскіх савецкіх чыноўнікаў да справы нацыянальна-культурнага разьвіцьця» і ўзмацненьня беларускай пралетарскай культуры.

Вялікадзяржаўны расійскі шавінізм, як ідэалёгія клясавага ворага, імкнецца прасякнуць (і прасякае) у асяродзішча пралетарыяту і ў асобныя зьвенькі партыі.

Наяўнасьць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, у бок недаацэнкі нацыянальных асаблівасьцей, у бок «высокамерна-нагарных адносін да гэтых асаблівасьцей» у асобных элемэнтаў унутры партыі патрабуе ўсямернага ўзмацненьня барацьбы з гэтым ухілам. Вялікадзяржаўныя ўхілістыя ў радах партыі, вялікадзяржаўныя шавіністыя, якія яшчэ трымаюцца ў нашых савецкіх, прафсаюзных, кааперацыйных апаратах, ва ўмовах сёнешняга дня з асаблівай сілай перашкаджаюць справе сацыялістычнага будаўніцтва, бо арыгінальнасьці ўхіламі ўнутры партыі. Генэральная ўстаноўка—галоўны і цэнтральны агонь на даным этапе па беларускім нацыянал-дэмакратызме—застаецца цалкам у моцы. Але ўсё гэта не паслабляе, а павінна яшчэ больш узмацніць нашу барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам.

Мы ня можам дазволіць, каб пад відам фальшывай барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам правалокваўся вялікадзяржаўны шавінізм.

У сваёй барацьбе супроць пралетарскай дыктатуры абодвы нацыяналізмы сходзяцца на агульнай платформе зрыву сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

Вялікадзяржаўны шавіністы зрываюць справу беларусізацыі, грае на руку беларускаму нацыянал-дэмакратызму. Ухілісты ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму дапамагае беларускаму нацыянал-апартунізму ў яго барацьбе супроць лініі партыі. Рашучая барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам як па-за партыяй, так і з яго праяўленьнямі ўнутры партыі, дапаможа справе барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Рашучая барацьба за баявыя тэмпы беларусізацыі зьяўляецца ўдарам і па перажытках вялікадзяржаўнага шавінізму і па беларускім нацыянал-дэмакратызьме.

Разам з гэтым партыя з усёй сілай б'е і будзе біць па тых «левых» крыкунох, па тых нацыянал-нігілістых, якія, пад прыкрыцьцём рэвалюцыйнага фразэрства аб «інтэрнацыяналізме», вядуць да зрыву нацыянал-культурнага будаўніцтва, перашкаджаюць справе вылучэньня мясцовых кадраў, перашкаджаюць далейшай карэнізацыі апаратаў, ня бачаць складанай абстаноўкі асаблівасьцей работы ў нацыянальнай рэспубліцы.

У той-жа час, вядучы непрымірымую барацьбу з усімі і ўсялякімі праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шавінізму, з супраціўленьнем справе беларусізацыі, партыя не дазволіць беларускім нацыянал-дэмакратам і нацыянал-апартуністым адыгрывацца, або адыграцца на барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам.

Яшчэ больш узмоцнім тэмпы беларусізацыі, яшчэ больш палепшым кіраўніцтва гэтай справай. Павядзем узмоцненую барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, узмоцнім ва многа раз нашу барацьбу з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам.

З бальшавіцкай энэргіяй наша партыя, будуючы Сацыялістычную Беларусь, разам з дапамогай усяго Саюзу, будзе зьніштажаць рэшткі фактычнае нярэвалюцыйнасьці нацыянальнасьцей. У бескампрамісная, бязьлітасная клясавай барацьбе мы будзем удар за ўдарам выбіваць нацыянал-дэмакратызм і нацыяналізм усіх колераў з усіх яго пазыцый. Унутры партыі мы будзем выкрываць нацыяналістычны і вялікадзяржаўны ўхілы, як ідэалёгічныя рупары клясавага ворага. Рашуча змагаючыся з нацыяналістычнымі ўхіламі, з прыміранцтвам да іх, з іх канкрэтнымі носьбітамі, КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго бальшавіцкага ЦК будзе з посьпехам ісьці ўперад на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

ЯН АСЬМОЎ.

Партыйнае будаўніцтва

Партыя моцна ўдарыць па тых, хто пад прыкрыцьцем „левых“ фраз праводзіць правыя справы

Пабальшавіцку вывучыць, папулярызаваць і выразна выканаць задачы, паказаныя ў артыкуле т. СТАЛІНА і ў пастанове ЦК УсеКП(б)

ЗА ЛІНІЮ ПАРТЫІ

Мы ўступілі ў новы рашаючы этап калгаснага будаўніцтва. Асноўную задачу гэтага этапу зьяўляецца замацаваньне дасягнутых посьпехаў па калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Рашучая барацьба за пасьпяховае ажыцьцяўленьне гэтае задачы на аснове апошняй пастановы ЦК УсеКП(б), барацьба за выразнае і цьвёрдае праведзеньне партыйнае лініі ў калгасным будаўніцтве зьяўляецца галоўнай умовай нашага пасьпяховага далейшага руху наперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы.

Замацаваньне дасягнутых посьпехаў па калектывізацыі сельскае гаспадаркі стварае аснову для хутчэйшага і поўнага выкананьня задач партыі па сацыялістычнай перабудове вёскі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнае калектывізацыі.

Усялякія перагібы і скажэньні лініі партыі ў калгасным будаўніцтве, усялякае адміністраваньне і заблганьне наперад без уліку мясцовых умоў пры ігнараваньні батрацтва і беднаты, усялякае парушэньне добраахвотнасьці і самадзейнасьці асноўных мас сялянства—толькі затрымліваюць і тармозяць калгаснае будаўніцтва і, значыць, льлюць ваду на млын правага апартунізму.

«Левыя» перагібы, антысерадняцкія скажэньні партыйнае лініі ў радзе выпадкаў зьяўляюцца простым вынікам праваапартуністычных настрояў і правай практыкі. Карэспандэнцыі, зьмешчаныя ў сёнешнім нумары «Зьвязды», выразна сьведчаць аб гэтым. Грубейшыя перагібы і скажэньні, дапушчаныя ў Самахвалавіцкім раёне, сталі магчымымі толькі ў выніку прыміранцкіх блізарукіх адносін да кулака і праваапартуністычнай недаацэнкі ролі батрацтва і беднаты, што мае месца ў раёне.

Карэспандэнцыя аб перагібах у Барысаўскім раёне добра паказвае, куды вядзе адміністраваньне, гонка за паперовай калектывізацыяй і ігнараваньне батрацка-бядняцкіх мас.

Вядучы рашучую барацьбу з праваапартуністычнаю тэорыяй і практыкай, як з асноўнаю небясьпекай, партыя будзе жорстка па-бальшавіцку змагацца з усялякімі «левымі» перагібамі, якія ў радзе выпадкаў льлюць ваду на млын правага апартунізму.

Усе гэтыя задачы выразна і ясна сфармуляваны і падкрэсьлены, як асноўныя задачы вялізарнае палітычнае важнасьці, у артыкуле тав. Сталіна «Головокружение от успехов» і апошняй пастанове ЦК УсеКП(б).

Тэму кожная партыйная арганізацыя павінна глыбока прапрацаваць і папулярызаваць артыкул тав. Сталіна і пастанову ЦК. Гэта зьяўляецца неабходнейшай умовай для пасьпяховага выкананьня на практыцы тых задач, якія паказаны ў артыкуле т. Сталіна і пастанове ЦК.

Між тым, асобныя арганізацыі яшчэ ня прыступілі да распрацоўкі артыкулу тав. Сталіна. Многія райкомы яшчэ ня далі ніякіх дырэктыў партыйным арганізацыям у гэтым напрамку. Напрыклад, бюро Магілеўскага АК КП(б)Б адзначыла, што большасьць раённых парт арганізацый акругі зусім не распрацоўвае артыкулу тав. Сталіна і не выпраўляе дапушчаных памылак і перагібаў. Дзе-ні-дзе асобныя райкомы захоўваюць артыкул тав. Сталіна, даўшы дырэктывы «лачакаць пакуль што» з распрацоўкай артыкулу. Характэрна, што гэтыя факты якраз выходзяць з тых раёнаў, дзе мясцовыя работнікі, адчуваючы галавакружэньне ад посьпехаў, дапусьцілі найбольшую колькасьць перагібаў і скажэньняў партыйнае лініі.

Для таго, каб захаваць ад партыйных мас сваё банкрутства, сваю нездольнасьць праводзіць партыйную лінію і выправіць дапушчаныя перагібы, асобныя работнікі укрываюць артыкул тав. Сталіна, заяўляюць, што артыкул «нас не датычыць» і г. д., і г. д. Такія факты мы маем у Сьмілавіцкім і Самахвалавіцкім раёнах.

Папулярызацыя і шырокая распрацоўка артыкулу тав. Сталіна і апошняй пастановы Цэнтральнага Камітэту—баявая найпершая задача. Толькі глыбока і дасканала распрацаваўшы і ўсьвядоміўшы гэтыя палітычныя дакуманты, партыйныя арганізацыі, на падставе іх, змогуць разгарнуць бальшавіцкую барацьбу за суцэльную калектывізацыю, за замацаваньне дасягнутых посьпехаў, за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе масавага калгаснага руху.

Асобны від прышыбееўшчыны

Група камуністых і камсамольцаў, студэнтаў Барысаўскага пэдтэхнікуму, прыехала ў Неманіцкі сельсавет праводзіць сход па пытаньні калектывізацыі.

Зрабіўшы агульны даклад на гэту тэму, не растлумачыўшы бедняком і серадняком сутнасьці калектывізацыі, не расказаўшы дасканала і зразумела аб арганізацыі работы ў калгасах, студэнты атрацу пасьля сходу прыступілі да... стварэньня калектыву. Перад кожным прысутным на сходзе пытаньне было паставлена рубам: або за калгас, або не. Студэнты выклікалі да стала на чарзе ўсіх сялян і тых, хто не галасаваў за ўступленьне ў калгас, прымушалі падпісваць паперу з наступным зьместам:

«Мы, сяляне, поўнасьцю ўсьвядомілі значэньне калектывізацыі сельскай гаспадаркі, але адмаўляемся ўступіць у калгас».

Дзеля чаго гэтым гора-калектывізатарам патрэбны былі такія подпісы? А для таго, каб мець дакумант, што яны добра растлумачылі сутнасьць калектывізацыі, але «мужик упорствует». Калі асобныя беднякі катэгарычна адмовіліся даць падпіску і правільна раскрытыкавалі ўчынак «калектывізатараў», то студэнты абзвалі гэтых беднякоў падкулачнікамі.

Такія мэтады зьяўляюцца адным з асобных самых шкодных, самых небясьпечных, самых наглых відаў прышыбееўшчыны. Між іншым, у гэтым-жа сельсавеце мясцовымі работнікамі дапушчаны грубыя скажэньні правільнай лініі. У сельсавеце быў выданы галаванцінскі загад аб спыненьні продажу ўсялякіх тавараў з кааперацыі тым бедняком і серадняком, якія ня ўступілі ў калгасы. Неманіцкая беднота, якая яшчэ ня ўступіла ў калектывы, пазбаўлена ўсіх спажывецкіх прадуктаў: солі, газы і г. д.

На жаль, факты грубых перагібаў і прышыбееўскага палыходу не зьяўляюцца адзіночнымі. У асобных сельсаветах Меншчыны мясцовыя прышыбеевы пад прыкрыцьцём «левых» фраз праводзяць права-апартуністычную лінію, ігна руючы батрацтва і беднату, дапускаючы анты-серадняцкія перагібы і праводзячы калектывізацыю мэтадамі націску і адміністраваньня.

Сакратар Швабскай ячэйкі (Лагойскі раён) арыштаваў на сходзе 5 беднякоў і сераднякоў за іх выступленьне супроць калектывізацыі. І гэта замест таго, каб растлумачыць бедняком і серадняком сутнасьць калектывізацыі, каб на канкрэтных прыкладах з жыцьця наўкольных калгасаў давесьці перавагу калектыўнай гаспадаркі. Як правіла, сакратар гэтай ячэйкі заўсёды праводзіць бядняцка-серадняцкія сходы, лагражаючы пага нам. Райком партыі не асадзіў гэтага Прышыбеева з партбілетам і ня зьняў яго з работы за дыскрэдытацыю калгаснага будаўніцтва.

Есьць рад фактаў, калі мясцовыя работнікі, дапусьціўшы грубыя перагібы, упарта адмаўляюцца выпраўляць свае памылкі. У Грэскім раёне была раскулачана частка серадняцтва. Калі гэтае недапушчальнае скажэньне партыйнай лініі было выкрыта, то работнікі Грэскага райкому заявілі:

«Ну, што-ж, памылку прызнаем, але выпраўляць не ня варта».

З такімі фактамі патрэбна самая рашучая і бязьлітасная барацьба, бо яны льлюць ваду на млын клясавага ворага. Трэба жорстка ўдарыць па руках прышыбеевых з партбілетамі, якія зрываюць і дыскрэдытуюць калектывізацыю.

Ів.

З ЛІСТОЎ АБ ПАРТВУЧОБЕ

Партыйна-камсамольская вучоба ў БДУ зрываецца. Палітгурткі, якія зьяўляюцца асноўным мэтадам вучобы ва ўнівэрсытэце, амаль не працуюць. Для характарыстыкі стану партыйна-камсамольскай вучобы ў БДУ варта падаць і некалькі прыкладаў з практыкі партыйна-камсамольскай арганізацыі факультэту права і гаспадаркі. Большасьць гурткоў факультэту не працуе. Гурткі не ўкамплектаваны кадрамі кіраўнікоў. Кіраўнікі мяняюцца амаль кожны дзень. Гурток права і марксызму яшчэ да гэтага часу не правёў ні аднаго сходу. За фактычны зрыў партыйна-камсамольскай вучобы павінна адказаць бюро партыйнай і камсамольскай ячэек.

Д.

* * *

У большасьці парт'ячеек Хоцімскага раёну (Магілеўшчына) партвучоба пачалася з вялікім спазьненьнем. Ячэйкі дзе. Парт'ячэйка калгасу «Чырвоны Кастрычнік» прыступіла да вучобы толькі ў лістападзе. Гэта спазьненьне адбілася на якасьці вучобы. Большасьць партшкол і палітгурткоў раёну працуе нездавальняюча.

М.

НА РУКУ КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ

ГРУБАЕ СКАЖЭНЬНЕ ПАРТЫЙНАЕ ЛІНІІ

Партыя дала выразныя і ясныя дырэктывы па пытаньнях калгаснага будаўніцтва і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнае калектывізацыі. Замацаваць дасягнутыя посьпехі па калгасным будаўніцтве і на гэтай аснове разгортваць далейшую работу на суцэльнай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, апіраючыся на добраахвотнасьць і самадзейнасьць асноўных мас сялянства—такая дырэктыва партыі.

Гэту дырэктыву груба парушыў Самахвалавіцкі раённы камітэт партыі (Менская акруга). Раённы камітэт дапусьціў рад буйных перагібаў і скажэньняў партыйнае лініі.

Калектывізацыя ў раёне праводзілася ў большасьці мэтадамі адміністраваньня і націску. Раённы камітэт не правёў папярэдняй агітацыйна-растлумачальнай работы і не забясьпечыў арганізацыі батрацка-бядняцкіх груп.

Ніякай работы па замацаваньні арганізаваных калгасаў не праводзілася.

Ня дзіва, што зараз большасьць калгасаў развалілася.

Вынікам існуючага ў райкоме і частцы партарганізацыі праваапартуністычнага ігнараваньня батрацтва і беднаты зьявіліся абураючыя перагібы і скажэньні партыйных дырэктыў.

У цэлым радзе сельсаветаў мясцовыя работнікі, у тым ліку партыйцы і камсамольцы, награжалі арыштам і высылкаю бедняком і серадняком, якія ня ўступалі ў калгасы. У раёне раскулачэньне мошна захранула серадняцкоў. У Рубілкаўскім сельсавеце мясцовыя прышыбеевы раскулачылі сераднякоў. Частка сераднякоў была арыштавана. У многіх сераднякоў была забрана ўся маемасьць і яны выгнаны з хат. І ў гэты-ж час у раёне яшчэ не раскулачана частка кулацтва.

Мясцовыя работнікі, раскулачваючы сераднякоў, у асобных выпадках не закраналі кулакоў. Як агульнае зьявішча, трэба адзначыць прымірэнчыя, ліберальныя адносіны многіх камуністых да кулацкіх элемэнтаў.

Бюро раённага камітэту з гэтым перагібамі і скажэньнямі змагалася зусім слаба. Пленум райкому, які адбыўся нядаўна, моўчкі абышоў дапушчаныя памылкі і перагібы і зусім не завастрыў увагі партарганізацыі на недапушчальнасьці ўсялякіх перагібаў і адміністраваньня ў калгасным будаўніцтве. Пленум ня ўдарыў па дапушчаных скажэньнях партыйнае лініі ў адносінах да серадняка і па «камуністых», якія праводзяць кулацкую лінію.

Цяпер стала ясным, да чаго прывяла праваапартуністычная лінія Самахвалавіцкага парткіраўніцтва. Калектывізацыя ў раёне, праведзеная ў большасьці выпадкаў мэтадамі адміністраваньня бяз удзелу беднаты і серадняцтва, развальваецца. З 33-х калгасаў, арганізаваных у раёне, засталося ня больш 5—6. Рэшта калгасаў развалілася.

Рашучае аздараўленьне кіраўніцтва Самахвалавіцкай партарганізацыі дапаможа выправіць дапушчаныя прарывы і разгарнуць у раёне сапраўднае бальшавіцкае калгаснае будаўніцтва.

Я. І—н.

За вучобай.



У ЧЫРВОНЫМ КУТЦУ КАЛГАСУ

АГЛЯД МІЖЗБОРАВАЙ РАБОТЫ

Акругком мае слабую інфармацыю аб становішчы міжзборавай работы

Падзіў 2 не скарыстоўвае ўсіх магчымасьцяй

Правядзеньне агляду яшчэ не забясьпечана

У пастанове сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб агляде міжзборавай работы ёсьць пункт 5, які кажа:

«Даручыць Менскаму Акруткому... забясьпечыць правядзеньне агляду праз сходы рабселькораў, праз выезды брыгад у раён кампляктаваньня, праз арганізацыю палётаў лёгкай кавалерыі і г. д.».

У культпропе АК на наша запытаньне, што ён робіць у справе агляду, работнікі культпропу адказалі, што аб такім агляде яны ня ведаюць і што паўна гэтай работай займаецца агітацыйна-масавы сэктар, і па пытаньнях міжзборавай работы можа даць адказ толькі тав. Тамашэўскі — ён-жа агітмас, ён-жа загадчык арганізацыйна - інструктарскім сэктарам.

Ні аб дырэктыве ЦК, ні аб дырэктыве, дазнанай самім акругкомам, работнікі Культпропу ня ведаюць.

Тав. Тамашэўскі аказаўся сапраўды больш асьвядомлены аб гэтым агляде. Акругком партыі даў райкомам даволі падрабязную дырэктыву аб правядзеньні агляду. На трохдзённыя зборы акругком мяркуе паслаць сваіх прадстаўнікоў.

Але якія вынікі гэтай дырэктывы акругком ня ведае. Дырэктыва напісана 8-га сакавіка, у раёны трапіла не раней чым 12-13 сакавіка. Гэта значыць, што напалову кампанія правалена.

На сакратарыяце і на бюро АК пытаньне гэта ня ставілі.

Наогул інфармацыю аб міжзборавай рабоце акругком мае вельмі агульную і то толькі ад Падзіву 2, а не ад райкомаў. Інфармацыя Падзіву 2 таксама вельмі невыстарчаная. Падзіў 2 ня высоўвае перад акругкомам асобных пытаньняў міжзборавай работы і сам падзіў не скарыстоўвае ўсіх магчымасьцяй інфармацыі (нарады сакратароў райкомаў і г. д.).

Агульны вынік, што міжзборавая работа яшчэ ня стала арганічнай часткай усяе работы акругкому. Дырэктывы акругкому па гэтым пытаньні ішлі па лініі толькі райкому і не датычыліся фракцыі ўстаноў, якія гэтай работай павінны займацца (акрвыканкомы, прафсаюзы, Асоавіяхім).

Трэба хутчэй устанавіць, які сэктар, будзе займацца міжзборавай работай.

Брыгада загаварылася, што на нарадзе сакратароў райкомаў, якая цяпер праходзіць, будзе пастаўлена пытаньне аб міжзборавай рабоце.

Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ».

Пераменьнікі ў кіраўнічай рабоце ня прымаюць удзелу

(Гутарка з сакратаром Халопеніцкага райкому КП(б)Б)

Халопеніцкі райком КП(б)Б атрымаў дырэктыву ад акругкому толькі 10 сакавіка аб тым, што з 1 сакавіка пачынаецца агляд міжзборавай работы.

Аднак, у раёне работу распачалі. Арганізавалі штаб на аглядзе міжзборавай работы і ўзмоцнена правялі падрыхтоўку да 3-хдзённага збору пераменьнікаў.

Праз парт'ячэйкі правялі сходы па сельсаветах, растлумачылі задачы 3-хдзённага збору, падрамантавалі памяшканьне вучобнага пункту і ўжо на збор прайшла здавальняюча.

Гэтымі днямі ў раёне выйдзе друкаваная раённая газэта, прысьвечаная 3-дзённаму збору і агляду міжзборавай работы.

У часе работы па калектывізацыі раёну пераменьнікі не аказаліся пачынальнікамі ў справе арганізацыі калгасаў. Асноўная маса пераменьнікаў пайшла ў калгасы, але ў кіраўнічай рабоце яны ў калгасах не вызначаюцца. Частка пераменьнікаў і да гэтага часу не пайшла ў калектывы.

Па пытаньнях калектывізацыі быў скліканы сход пераменьнікаў у раёне і сельсаветах. Гэтыя сходы праводзіліся работнікамі палка, па ініцыятыве райкому.

Калі праводзіліся аднадзённыя зборы, дык вынікі збору заслухоўваліся на бюро РК, пры справаздачах ячэек пытаньні міжзборавай работы ўвязваюцца з работай Асоавіяхіму. Аднак, райком канстатаваў, што ячэйкі мала звараюць увагі на міжзборавую работу.

Напрыклад, пераменьнік падпісаўся ў палку на пазыку, прышоўшы дамоў, ён забывае пра гэта, перагулярна ўносіць грошы, а часамі і адмаўляецца ад пазыкі.

Была праведзена ў раёне канфэрэнцыя Асоавіяхіму з мэтай большага ахвяраваньня пераменьнікаў ваеннай работай. У раёне ёсьць два гурткі ваенных ведаў, але арганізаваць пры кожнай хаце-чытальні гурток немагчыма, бо няма кіраўнікоў.

Сярод пераменьнікаў 20 проц. няпісьменных. Разгорнута сетка лікпунктаў, стацыянарак і гурткоў, што дасьць магчымасьць да асеньняга збору даць 98 проц. пісьменных пераменьнікаў.

У часе перавыбарчай кампаніі сельсаветаў маса пераменьнікаў рэзка не вызначалася, аднак, у складзе сельсаветаў ёсьць каля 35 проц. пераменьнікаў і з 11 старшынь сельсаветаў—4 пераменьнікі.

Калі скончыцца 3-хдзенны збор, райком падагуліць вынікі і яшчэ больш разгорне кампанію па аглядзе міжзборавай работы, узмоцніць сувязь з палком, завострыць увагу ячэек і іншых устаноў на необходнасьці больш увагі аддаць міжзборавай рабоце.

Брыгада «Зьвязды».

КРЫВАВЫЯ Т'ЕРЫ ПАД ЗНАКАМ БЕЛАГА АРЛА

Калі гэрайная барацьба парыскіх камунараў была ўтоплена ў крыві тысяч расстрэляных і замучаных рэвалюцыянэраў, калі вэрсальскія салдаты ўварваліся ў Парыж, «кровожадный карлик» Т'ер заняў нацыянальнаму сабраньню: «Справа справядлівасьці, парадку, чалавечнасьці і цывілізацыі перамагла!»

Але, ня гледзячы на тое, што ў імя «справядлівасьці і парадку» перамогшая буржуазія зрабіла такую разьню, якое Парыж яшчэ ня бачыў, справа Парыскай Камуны не памёрла. Яна ператварылася ў плоць і кроў вялікай рэвалюцыйнай барацьбы міжнароднага пралетарыяту, які вучыцца на перажываньнях і памылках Камуны і зьбіраў і арганізоўваў свае сілы для новых штурмаў буржуазнага сьвету. Міжнародны пралетарыят мае цяпер сваю краіну, краіну перамогшай рэвалюцыі, апору Камінтэрну—гэтай сусьветнай бальшавіцкай партыі.

Супроць гэтай краіны, якраз цяпер, калі мы адзначаем 59-ую гадавіну Парыскай Камуны, увесь буржуазны сьвет вядзе асьпервялелую кампанію хлусьні і падрыхтоўку крыжовага паходу. І клясавыя мэты, якія ставяцца ў падрыхтоўцы гэтага паходу—зьнішчэньне пралетарскай дзяржавы—так, як і 59 год таму назад, прыкрываюцца высокамоўнымі словамі—«у імя парадку, цывілізацыі, чалавечнасьці і справядлівасьці». Уся прэса капіталістычнага сьвету лемантуе аб «прасьвядчаньных раліґіі», якія быццам-бы адбываюцца ў СССР. Жоўтыя «Форвэртсы» і «Роботнікі» разам з чорнасоценнымі пагромшчыкамі, кэрэнзды разам з рабінамі, пацыфісцкія балбатуны разам з генэральнымі штабамі, беларускія нацыянал-фашыстыя ў саюзе з польскімі акупантамі кожны дзень трубяць аб «чырвоным тэроры», аб «прыватнай уласнасьці», якая тончацца працоўнымі СССР, аб «страшных бальшавіках», аб мілых для іх імпэрыялістцкага сэрца кулаках і г. д. і г. д. І ўсе гэта хаўра Луцкевічам, зьяўляюцца актыўнымі правадзіцелямі гэтай «прэвэнтыўнай» вайны, якую вядзе буржуазія супроць рэвалюцыйнага руху. Сацыял-фашыцкія дружыны разьбіваюць дэманстрацыі, забіваюць рабочых і працоўных сялян, служаць у дэфэнзыве, напаўняюць шпікамі фабрыкі і заводы.

У турмах пакутуюць 10.000 палітзьняволеных. Каля 2.500 з іх—працоўныя Зах. Беларусі. А што робіцца цяпер за мурамі польскіх турмаў—гэтых белых трунаў, гэтых скрыняў сьмерці! Крывавыя гэрої «цывілізацыі, чалавечнасьці, і парадку» забіваюць 10.000 рабочых і працоўных сялян, самых лепшых пралетаўнікоў рэвалюцыйнай армії. Вышуканымі зьдзекамі і катаваньнямі, самымі «цывілізаванымі» сродкамі яны «арганізуюць» навольную сьмерць для сваіх палонікаў—салдат рэвалюцыйнай барацьбы. Наша прэса ня раз пісала ўжо аб тым, што робіцца ў польскіх турмах. Але новыя весткі, якія ідуць адтуль, гавораць аб новых і новых фактах крывавых злачынстваў польскага фашызму. Новы турэмны рэгламін, які прыраўноўвае палітзьняволеных да становішча крымінальных, праводзіцца ва ўсіх турмах. Палітзьняволеныя пазбаўляюцца агульных камэр (Вільня, Беласток), бібліятэк, мэдыцынскай дапамогі. Харчаваньне палітзьняўняў значна пагоршваецца:

«Адтрымліваем прытухлую крупу, гнілую бульбу і капусту, хлеб зьмешаны з салемай і бруквай, так што палітзьняволеныя адданы на галодную сьмерць... За малейшае супраціўленьне палітзьняволеныя караюцца карцарам, цьвёрдым ложкам, на сухім хлебе і вадзе, пазбаўляюцца пабачэньняў, кніг, спыткаў, спацыраў. У Горадні палітзьняволеныя пазбаўлены пабачэньняў, кніг, 2-хгадзіннага вячэрняга сьвятла за тое, што яны адміраліся летам у вялікую сьпёку на сіцьцёплую вопратку. У Вільні і Берасьці пабоі палітзьняўняў сталі штодзённым зьявішчам у жыцьці фашыскай Польшчы. Толькі зусім нядаўна ў невялікім рабочым гарадку на Зах. Украіны—Сапоках, у дзень 8-га сакавіка азьвярэлая фашыцкая паліцэйшчына зрабіла крывавую лазьню для дэманструючых беспрацоўных і рабочых фабрыкі будовы вагонаў. Шматлікія арышты на Зах. Беларусі дзень за днём кідаюць у турмы дзесяткі ўсё новых і новыхахвяр акупацыі. Арыштоўваюцца члены легальных нацыянальных арганізацый—ТВШ, сакратарыятаў рабоча-сялянскага беларускага клюбу сойму і г. д. Зачыняюцца ўсе левыя прафсаюзы. Усё часьцей ладзяцца масавыя працэсы рабочых і сялян. Вось і цяпер, у гэтыя дні, у Горадні адбываецца вялікі працэс «51» рабочага і селяніна ЗБ. У дэфэнзывах, не цёмных засьценках, адбываюцца сярэднявечныя катаваньні і зьдзекі над палітычнымі вязьнямі. Фашызм імкнецца, перш за ўсё, фізычна зьнішчыць авангард працоўных—камуністычную партыю. Усе гарады і вёскі напоўнены паліцэйскімі шпікамі. Будуюцца новыя турмы. Павялічваецца бюджэты для міністэрства ўнутраных спраў на барацьбу з камунізмам. Сацыял-фашыстыя і беларускія нацыянал-фашыстыя на чале з Луцкевічам, зьяўляюцца актыўнымі правадзіцелямі гэтай «прэвэнтыўнай» вайны, якую вядзе буржуазія супроць рэвалюцыйнага руху. Сацыял-фашыцкія дружыны разьбіваюць дэманстрацыі, забіваюць рабочых і працоўных сялян, служаць у дэфэнзыве, напаўняюць шпікамі фабрыкі і заводы.

У турмах пакутуюць 10.000 палітзьняволеных. Каля 2.500 з іх—працоўныя Зах. Беларусі. А што робіцца цяпер за мурамі польскіх турмаў—гэтых белых трунаў, гэтых скрыняў сьмерці! Крывавыя гэрої «цывілізацыі, чалавечнасьці, і парадку» забіваюць 10.000 рабочых і працоўных сялян, самых лепшых пралетаўнікоў рэвалюцыйнай армії. Вышуканымі зьдзекамі і катаваньнямі, самымі «цывілізаванымі» сродкамі яны «арганізуюць» навольную сьмерць для сваіх палонікаў—салдат рэвалюцыйнай барацьбы. Наша прэса ня раз пісала ўжо аб тым, што робіцца ў польскіх турмах. Але новыя весткі, якія ідуць адтуль, гавораць аб новых і новых фактах крывавых злачынстваў польскага фашызму. Новы турэмны рэгламін, які прыраўноўвае палітзьняволеных да становішча крымінальных, праводзіцца ва ўсіх турмах. Палітзьняволеныя пазбаўляюцца агульных камэр (Вільня, Беласток), бібліятэк, мэдыцынскай дапамогі. Харчаваньне палітзьняўняў значна пагоршваецца:

«Адтрымліваем прытухлую крупу, гнілую бульбу і капусту, хлеб зьмешаны з салемай і бруквай, так што палітзьняволеныя адданы на галодную сьмерць... За малейшае супраціўленьне палітзьняволеныя караюцца карцарам, цьвёрдым ложкам, на сухім хлебе і вадзе, пазбаўляюцца пабачэньняў, кніг, спыткаў, спацыраў. У Горадні палітзьняволеныя пазбаўлены пабачэньняў, кніг, 2-хгадзіннага вячэрняга сьвятла за тое, што яны адміраліся летам у вялікую сьпёку на сіцьцёплую вопратку. У Вільні і Берасьці пабоі палітзьняўняў сталі штодзённым зьявішчам у жыцьці фашыскай Польшчы. Толькі зусім нядаўна ў невялікім рабочым гарадку на Зах. Украіны—Сапоках, у дзень 8-га сакавіка азьвярэлая фашыцкая паліцэйшчына зрабіла крывавую лазьню для дэманструючых беспрацоўных і рабочых фабрыкі будовы вагонаў. Шматлікія арышты на Зах. Беларусі дзень за днём кідаюць у турмы дзесяткі ўсё новых і новыхахвяр акупацыі.

Умацняючы падрыхтоўку да сяўбы калгасаў, не забываць пра індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі

Кулак прабуе сарваць сяўбу. Недаацэнка значэньня пашырэньня пасеўнае плошчы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на руку клясаваму ворагу

Індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі не мабілізаваны да сяўбы

На сёнешні дзень індывідуальны сэктар сельскае гаспадаркі БССР займае яшчэ 35 проц. пахатнае плошчы. Не калектывізавана 44 проц. індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на плошчы прыблізна 1.500.000 гэкт.

Гэта паказвае, што з перапясоньнем цэнтру ўвагі на падрыхтоўку да сяўбы ў сацыялістычным сэктары, ні на адну хвіліну нельга забываць аб пашырэньні пасеўнай плошчы ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках, якіх у БССР яшчэ налічваецца звыш 350.000.

Між тым, ні зямельныя органы на чале з НКЗ БССР, ні работнікі на месцах не ведаюць, як рыхтуецца да сяўбы індывідуальны сэктар.

Паводле адрывачных даных можна меркаваць, што са справай падрыхтоўкі індывідуальнага сэктару да сяўбы ў нас нездавальняюча. Асабліва дрэнна ідзе выкананьне прасьцейшых агра-мерапрыемстваў па індывідуальным сэктары. Насеньне ачышчаецца слаба. Попел зьбіраецца дрэнна.

Побач з аддачаю належнай увагі выкананьню індывідуальным сэктарам прасьцейшых агра-мерапрыемстваў, трэба зараз-жа праверыць, ці забясьпечаны індывідуальныя бядняцкія гаспадаркі ўсім неабходным да сяўбы. У прыватнасьці, неабходна выявіць, ці забясьпечаны бядняцкія гаспадаркі насеньнем, што робяць камітэты ўзаемадапамогі ў гэтых адносінах. На сёнешні дзень камітэты ўзаемадапамогі сабралі ўсяго 36.000 пудоў насеньня збожжавых культур, г. зн. выканалі ўсяго 57 проц. пляну. Ужо зараз можна сказаць, што гэтай колькасьці насеньня ня хопіць для забясьпячэньня патрэб бядняцкіх гаспадарак. Адсюль вывад—камітэты ўзаемадапамогі павінны ўзмацніць збор насеньня і свой плян выканаць поўнасьцю.

Неабходна таксама прыняць належныя меры да папулярызацыі новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку, які надае сялянству за выкананьне мерапрыемстваў па аграмінімуме і зоамінімуме шырокія ільготы. Між тым, да гэтага часу яшчэ новы закон не знайшоў шырокага асьвятленьня сярод бядняцка-серадняцкіх мас.

Л. Н.

ЗАВОЗ СРОДКАЎ ВЫТВОРЧАСЬЦІ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫ

Асабліва адстае беларуская прамысловасьць і загатоўка траў у межах БССР

Завоз у БССР с.-г. машын, запасных частак, угнаеньня, насеньня, сродкаў барацьбы са шкоднікамі праходзіць нездавальняюча.

Хоць агульны плян завозу плугоў і выкананы на 71 проц., аднак, перадковых-аднакорпусных, рамных-двухкорпусных, завезена толькі 59 проц.

Барон завезена ўсяго 66 проц., але па мскавых баронах плян выкананы больш на 26 проц.

Замест 170 трактараў адгружана толькі 12—7 проц. пляну завозу.

Пагражаючае становішча з запаснымі часткамі. Заводы адгружаюць запасныя часткі ня тых спэцыфікацый, якія патрэбны, і зусім ня прытрымліваюцца даных заявак. Задніх калёс паўночных прыслана ў тры разы больш, чым заказана, крышак блёку цыліндраў — у 10 раз больш і г. д. Побач з гэтым зусім не адгружаюцца заказаныя кольцы паршнёвыя, кажухі-камутатараў, ролікі, кулькі-падшыпнікі, трансмісійныя шасьцярні і г. д. Неадгрузка патрэбных запасных частак не дае магчымасьці скончыць рамонт трактараў.

Надзвычайна дрэнна з завозам насеньня карманых траў. Канюшыны замест 830 тон, адгружана 300 — 36 проц вікі — замест 1.250 тон, 500 — 40 проц і г. д. Ня лепш і са штучным угнаеньнем. На суперфасфаце завоз выкананы на 41 проц., па сульфатамонію — з 1.000 тон не адгружана ні аднаго кілё. Выявілася, між іншым, што да 1-га сакавіка Хімсындыкат не перадаваў навіч заяўкі заводам на адгрузку угнаеньня БССР. Па фасфарытнай муцэ завоз выканаць у 15.000 тон, завезена 1.244 тоны — 8 проц. Тут, між іншым, віна і белгуразага «Стрэмтрэсту».

Зусім не паступовае апаратура для барацьбы з палявымі шкоднікамі. Замест 480 конных апырсквацеляў, атрымала толькі 40 — 8 а палов. проц.

Маталяў для рамонту с.-г. машын замест выдзеленага кантынгенту ў 1 590 тон атрымана толькі 630 тон.

З вылучаных Наркамзэмам СССР для будаўніцтва ў БССР 1.000 тон гатункового жалеза ВМС не адгрузіў ні аднаго кілё.

Дрэнна з цьвікамі. Патрэбнасьць вызначана ў 1.050 тон. Адгружана-ж 158 тон.

Замест 122 камплектаў абсталяваньня для рамонтных майстэрань паступіла толькі 15, або 16 проц.

Вось канкрэтныя віноватыя: заводы «Октябрьская революция» (Адэса), «Плуг и Молот» (Нікалаеў), «Красный Аксай» (Растоў-на-Доне), імя Пятроўскага (Хэрсон), «Красная Звезда» (Зіноўеўск), «Красный Путиловец». Нарады гэтым заводам былі даны свячасова.

Яшчэ горш з адгрукаю с.-г. прылад беларускімі заводамі і загатоўкаю дроў у межах БССР.

Віцебскі завод Белмэталятрэсту «Чырвоны Мэталісты» замест 6.000 акучнікаў адгрузіў у першым паўгодзьдзі... 5. Гэты-ж завод павінен быў адгрузіць 2.250 плугоў № 2, але дагэтуль не атрымана ні аднаго плуга.

Ня лепш абстаіць справа з загатоўкаю насеньня траў і зялёных угнаеньняў унутры БССР. Белкаапсаюз, напрыклад, загатовіў лубіну — 1,9 проц. заданьня, вікі — 45,6 проц., цімафеўкі — 15,7 проц. Такія-ж даныя і па Белпаляводсаюзе. Па асобных округах наглядаецца амаль поўная адсутнасьць работы па загатоўцы насеньня. Так, Полацкая округа загатовіла на 10 сакавіка ўсяго... 8 кілё сэрадэлі.

У некаторых округах спажывецкая кааперацыя праяўляе злачынную адносіны да загатоўкі насеньня.

АБНАВІЦЬ КІРАЎНІЦТВА ДУБРОВЕНСКАГА РАЕНУ

Дубровеншчына сустракае сяўбу непадрыхтаванай

Пра абураючыя скрыўленьні партыйнай лініі пры калектывізацыі ў Дубровенскім раёне, Аршанскае акругі я ўжо пісаў. **А вось і яскравы малюнак поўнай бязьдзейнасьці мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый у галіне падрыхтоўкі да сяўбы. Становішча-ж з работай па падрыхтоўцы да с.-г. кампаніі інакш ня можа быць ахарактарызавана, як катастрафічнае.**

Да гэтага часу яшчэ не зямляўпарадкаваны ні адзін калгас. Няма ні аднаго вытворчага пляну ў калгасах. Ні ў адным калгасе праца не арганізавана. На складах райналяводсаюзу ёсьць гатунковае насеньне і розныя машыны, але «мы яшчэ ня ведаем, куды іх пасылаць» — гавораць працаўнікі.

Пляну крэдытаваньня няма. Сродкаў на трактары сабрана 0,38 проц. заданьня: трэба 40.000 р., сабрана-ж 500 руб.

Як стаіць справа з рамонтам інвэнтару — у раёне ня ведаюць. Гропы, вызначаныя на пабудову майстэрні, не скарыстоўваюцца — ляжаць.

У кожным сельсавеце, на левым беразе Дняпра,, ёсьць каморнік і аграном. Між тым, нават да арганізацыі машына-конных станцый не прыступалі, а аб арганізацыі працы і гаварыць ня прыходзіцца. Нічога ня робіцца ў гэй частцы раёну, якая далучаецца да Лядзянскага агракамбінату.

Попелу сабрана 74,7 тоны, замест 3.513. Вапнаперабілка не змагла па нядбайнасьці як раёну так і округі, працаваць аж да апошняга часу, а яна павінна абслужыць два раёны (Дубровенскі і Лядзянскі). Ляжыць на беразе Дняпра 2.000 т. вапнянага каменю пад нагрозай размыву вадой, а калі вапна будзе ў саўгасах і калгасах—невядома.

Кантрактуюць пасеў такім тэмпам, нібы да сяўбы засталося ня 2-3 тыдні, а наўгода. Закантрактавалі 33 проц. збожжавых культур, 40 проц. насеньня траў. Па жывёле — нічога.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць наступнае: **тое назначнае, што робіцца, праводзіцца без прыцягненьня беднаты, без папярэдняй растлумачальнай кампаніі. На падрыхтоўку індывідуальнага сэктару — ніякай увагі.**

Груп беднаты пры калгасах, як правіла, ня існуе. Групы беднаты, якія існавалі пры сельсаветах, і тыя разваліліся.

З усяго гэтага можна зрабіць адзін вывад: **партыйна-савецкае кіраўніцтва не стаіць на чале калгаснага руху і ня кіруе падрыхтоўкай да бальшавіцкай вясны.**

Кіраўніцтва, нездольнае ажыцьцяўляць важнейшыя дырэктывы партыі, патрабуе тэрміновага аднаўленьня.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

Унікнуць перагібаў пры абагуленьні кармоў

Няправільная дырэктыва Капаткевіцкага райкалгассаюзу

Капаткевіцкі райкалгассаюз (Мазырская акруга) зусім правільна зрабіў, калі парашыў энэргічна ўзяцца за стварэньне кармовых фондаў у калгасах. Аднак, дырэктыва, якую ён даў па калгасах у гэтым пытаньні, ні ў якім выпадку ня можа быць прызнана правільнай. А ў гэтай дырэктыве гаворыцца: «Абагуліць усе кармы, якія ёсьць у калгасьнікаў».

Даючы такую ляпа няправільную дырэктыву, райкалгассаюз не патурбаваўся нават наперад правесьці адпаведную растлумачальную кампанію, растлумачыць, з якою мэтаю трэба складаць абагуленыя кармавыя фонды. Па калгасах, акрамя таго, ня быў складзены плян стварэньня кармавое базы.

Нічога няма дзіўнага, што дырэктыва райкалгассаюзу, хаця і была атрымана па мясцох, але засталася нявыкананай. Частка калгасьнікаў не згадзілася на абагуленьне ўсіх кармоў, якія ў іх ёсьць, бо ў індывідуальным карыстаньні кожнага з іх застаецца карова і дробная жывёла, якую таксама трэба карміць.

Гэта гаворыць аб тым, што праводзячы абагуленьне кармоў, ня трэба ажыцьцяўляць гэтай важнай дырэктывы ў тым напрамку, каб «абагуліць усё», а прымаць пад увагу неабходнасьць пакіданьня калгасьніку кармоў для тэй жывёлы, якая пакідаецца ў яго індывідуальнае карыстаньне. Няма ніякага сумненьня, што калі правільна праводзіць абагуленьне кармоў, дык гэта справа бязумоўна будзе ажыцьцёўлена хутка і з посьпехам.

Брыгадзіры «Зьвязды»
М. Л. і А. Ш.

Псуецца 150 вагонаў сена

Злачынная нядбайнасьць Саюзхлеба

Ня гледзячы на напружанае становішча з кормам у некаторых раёнах Беларусі, Саюзхлеб праяўляе злачынную нядбайнасьць да захаваньня нават таго запасу грубога корму, які ў яго ёсьць. Сотні вагонаў з сенам гніюць. Сена, якое атрымліваецца ад Саюзхлеба, вельмі дрэннай якасьці. Адзначаны выпадкак, калі да 70 проц. сена з 3-х вагонаў, якія былі атрыманы Менскім малочна - жывёлагадоўчым саюзам, былі зусім нездатнымі. У Меншчыне, з прычыны нядбайнага захаваньня, псуецца звыш 150 вагонаў сена. Яно дрэнна зложана і знаходзіцца пад адкрытым небам. Сьцірты не адпавядаюць стандарту. Пры прасоўцы была дапушчана нядбайнасьць, сена зьмяшана з сьнегам, лёдам і інш.

У прыватнасьці, у саўгасе Рудня, Чэрвеньскага раёну, псуецца 25 вагонаў сена, каля ст. Пуханічы — 20 вагонаў, каля Шацку — 30 вагонаў. Нават у Менску на складзе Саюзхлеба ёсьць каля 40 вагонаў сена, якое дрэнна захоўваецца.

У Гомельшчыне адкормачныя пункты цэрпяць ад недахопу корму, а заводы Белдзяржсьпірту прадаюць свае адкіды па прыватны рынак.

Вызначаныя для БССР 27.800 тон канцэнтраваных кармоў забясьпечаць патрэбы на 25-30 проц. Але адгрузка нават гэтай колькасьці кармоў праходзіць нездавальняюча. Нарад на адгрузку 1.800 тон канцэнтраваных кармоў быў дадзены Белмалжывсаюзам яшчэ ў сьнежні, але да гэтага часу нічога не адгружана.

Цяжкае становішча з канцэнтраваным кормам перажываюць і малочныя фэрмы, якія арганізаваны Белмалжывсаюзам каля гарадоў. Гэтыя фэрмы маюць ужо каля 5.000 кароў, але зусім не забясьпечаны канцэнтраваным кормам. Наркамгандаль БССР усю норму па сакавік у 23 вагоны жмыхоў перадаў Белсельтрэсту, у той час, як Белсельтрэст зараз ня мае патрэбы ва ўсёй гэтай колькасьці корму.

Такое становішча з канцэнтраваным кормам ставіць пад пагрозу выкананьне плянавых заданьняў па кантрактацыі малака, мясной і малочнай жывёлы, а таксама па адкорме, утрыманьні маладняку і г. д.

М. К.

Яшчэ аб брагінскіх „очковтирателях“

Гэтымі днямі «Зьвязда» паведамляла аб перагібах пры калектывізацыі ў Брагінскім раёне, Гомельскай акругі, і аб тым, што мясцовыя арганізацыі займаліся «очковтирательством», паказваючы ў зводках значна павялічаныя процанты, якія зусім не адпавядалі сапраўднаму стану рэчаў.

Вось новыя пацьвярджэньні гэтага. На сёньнешні дзень у раёне калектывізавана толькі 35 проц. гаспадарак, а ня 68 проц., як гэта паведамляні раённыя арганізацыі. Насеньня абагулена ўсяго 4.635 цэнтнэраў, г. зн. выканана 55,4% заданьня. З рабочай скаціны абагулена па 10 сакавіка 1.043 коняй, або 29 проц. заданьня.

Узорная работа

У Азяранскім сельсавеце, Тураўскага раёну, праведзена суцэльная калектывізацыя. На тэрыторыі сельсавету арганізавана 7 калгасаў. Абагуленьне і вычыстка збожжа праведзены на ўсе 100 проц. У сельсавеце раскулачана 26 кулакоў. Уся маемасьць кулацкіх гаспадарак перадана калгасам.

Праўленьні калгасаў пачалі ўжо будаваць і абсталёўваць стайні для абагуленае рабочае жывёлы.

Сяляне вёскі Азяраны 2 дні працавалі на лесазагатоўках і ўвесь свой заработак за гэты час пастанавілі аддаць на куплю трактараў.

Калгасьнік.

Забытая галіна сельскай гаспадаркі

За 5 год на разьвіцьцё агароднiцтва не адпушчана ні аднэй капейкі крэдытаў

Ліставадаўскі пленум ЦК УсеКП(б) даў дырэктыву партыйным, савецкім і кааперацыйным арганізацыям палепшыць забясьпячэньне рабочага насельніцтва гародніной. Гэта дырэктыва ў БССР амаль ня выконвацца.

Датэтуль у БССР агароднiцтва зусім не разьвівалася. На яго не зварачалася амаль ніякай увагі. Так, напрыклад, у 1929 годзе пад агародамі было занята 48.254 гэкт., або 1,4 проц. усёй пасеўнай плошчы рэспублікі.

3,7 проц. плошчы, занятай агародамі, знаходзілася ў саўгасах; толькі 3 проц. — у калгасах: 93 проц. у індывідуальных сялянскіх гаспадарках.

Такім чынам, мы бачым, што пераважная большасьць агародаў знаходзілася ў сялянскім сэктары; напрамак агароднiцтва спажывецкі і ў вельмі нязначнай колькасьці таварны і поўтаварны. Плошчы саўгаскіх і калгаскіх агародаў былі надзвычайна малыя і скарыстоўваліся пад кораньплоды — кармавыя буракі і г. д.

Такім чынам, агароднiцтва ў БССР знаходзілася на заднім пляне, і ня прымалася ніякіх мер да яго разьвіцьця; **сыстэма с.-г. крэдыту за 5 год не адпусьціла ні аднэй капейкі на разьвіцьцё агароднiцтва;** толькі ў бягучым годзе маркуецца адпусьціць 225.000 руб. на садоўніцтва і агароднiцтва.

Ня ў лепшым стане знаходзіцца падрыхтоўка кадраў для садоў і агародаў. Так, напрыклад, Горацкая с.-г. акадэмія маркуе выпусьціць толькі 24-х агранамаў - садаводаў і гароднікаў, прычым да канца пяцігодкі больш выпускаў ня будзе.

Пастанова Эканомнарады аб абавязковым складаньні акрыкаванкомамі і НКЗ плянаў разьвіцьця гароднiцтва зусім ня выканана. Толькі адна Бабруйшчына больш-менш абмеркавала гэтае пытаньне.

Вельмі мала зроблена для **арганізацыі садова - агародніх гаспадарак у саўгасах і калгасах.** Толькі некаторыя арганізацыі зрабілі некаторыя самастойныя крокі па арганізацыі агародніх гаспадарак. У Гомелі ЦРК маркуе арганізаваць гаспадарку на плошчы 1.400 гэкт. У Віцебску маркуецца арганізаваць адзін агародны калгас на плошчы 200 гэкт. Вось і ўсё.

Мерапрыемствы па пашырэньні гароднiцтва — нерэальныя, паколькі яны не забясьпечаны асноўнымі сродкамі вытворчасьці. Плянавыя заданьні па загатоўцы агароднага насеньня выкананы на 48 проц., па машынных прыладах—на 23 проц., па загатоўцы апаратаў для барацьбы са шкоднікамі — на 54 проц.

Садова - агародная кааперацыя амаль нічога не зрабіла, каб пашырыць прамысловае гароднiцтва. Складаньне вытворчых плянаў распачата толькі ў сярэдзіне лютага, а па некаторых мясцох у пачатку сакавіка. Апрача таго, сыстэма садова - агароднай кааперацыі часткова засьмечана заможна - кулацкімі элемэнтамі; так, напрыклад, паводле даных Менскай, Гомельскай і Магілеўскай округ, у садова - агароднiцкай кааперацыі налічваецца 10 проц. заможна-кулацкіх элемэнтаў.

Надзвычайна вольна разьвіваецца **агародняе насенаводзтва.** Падрыхтоўка да гэтай справы амаль што сарвана з-за непаваротлівасьці і бюракратызму некаторых зямельных органаў. Гомельскі акраз разаслаў абежнік аб тым, каб пакінулі гародніну на насеньне толькі ў канцы кастрычніка, калі гародніна была сабрана з агародаў.

Патрэбны неадкладныя і рашучыя меры для разьвіцьця гароднiцтва, арганізацыі агародня - садовых гаспадарак.

Ф. К.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Казённыя адносіны да важнейшага пытаньня

ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б) АБ АДЗІНАНАЧАЛЬЛІ ПРАПРАЦАВАНА ПРАФСАЮЗАМІ ТОЛЬКІ У КАМПАНЕЙСКІМ ПАРАДКУ

На прадпрыемствах усё яшчэ няма выразнасьці ў падзеле функцый паміж кіраўнікамі

Да прапрацоўкі пастановы ЦК аб адзінаначальлі амаль усе прафсаюзы падыйшлі мэханічна: далі дырэктывы мясцом аб неабходнасьці азнаямленьня рабочых з пастановай і гэтым абмежаваліся. Факты, якія яшчэ і сёньня маюць месца на радзе прадпрыемстваў, гавораць аб тым, што ня толькі рабочыя, але нават і заводзкія кіраўнікі не ўсьвядомілі, як належыць, сэнсу дырэктывы партыі аб адзінаначальлі.

Калі на заводзе «Камунар» (Менск) трэба было паслаць рабочага ў 10-дзённы фізкультурны паход у калгасы, старшыня заўкому, без усякай дагаворанасьці з адміністрацыяй, выняў рабочага з работы.

Таксама зрабіў заўком заводу «Энэргія», калі яму патрэбна было паслаць у трактарную калёну 5 чалавек.

На заводзе «Чырвоны Мэталісты» ў Віцебску быў выпадак, калі адміністрацыя мэханічна зьнізіла расцэнкі і разрады групе рабочых, а ня пратэст заўкому адказала—«напляваць на заўком цынер адзінаначальле».

На гарбарні «Бальшавік» майстры бацяцца ўзяць на сябе адказнасьць за работу цэхаў і калі, напрыклад, трэба разьмеркаваць рабочую сілу ўнутры цэху, бегаюць да дырэктара заводу.

На станцыі Менск былі выпадкі непадпарадкаваньня грузчыкаў загадам адміністрацыі: грузчыкі самавольна захапілі больш выгодныя работы, а мясцком на гэта глядзеў скрозь пальцы.

На менскай футравай фабрыцы адсутнасьць выразнага падзелу абавязкаў паміж адміністрацыйна-тэхнічным персаналам прывяла да зрыву прамфінплану.

На віцебскім фанэрным заводзе заўком за нейкія ўчынкі зьняў з работы двух майстроў, а адміністрацыя нават аб гэтым ня ведала.

На Гомельскім вучастку чыгункі начальнік станцыі прымаў рабочых біржы працы, а калі заўком пачаў супярэчыць, начальнік адказаў—«цынер адзінаначальле, працу ў мае справы ня ўмешвацца».

На вучастку шляху станцыі Менск начальнік станцыі так адказвае рабочаму, які патрабуе павялічыць сабе разрад—«я-б табе павялічыў разрад, але заўком супярэчыць», пераводзячы-ж рабочага на горшую работу, заяўляе гэтаму рабочаму—«братка, я-б цябе не пераўёў, але заўком намагаецца».

Вось гэтыя факты лепш за ўсё сьведчаць аб сапраўднай «грунтоўнасьці» пра працоўкі дырэктывы аб адзінаначальлі нашымі прафсаюзамі і нізавымі прафячэйкамі. Нават самі нэйтральныя праўленьні прафсаюзаў ня ведаюць пункту ажыцьцяўленьня дырэктывы ЦК аб адзінаначальлі. **ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў** толькі гэтымі днямі паслала запытаньне нізавым прафячэйкам, як яны прапрацавалі дырэктыву аб адзінаначальлі. Работнікі ЦП саюзу шэйнікаў адкрыта прызнаюцца, што яны пытаньне аб адзінаначальлі прапрацавалі невыстарчальна і таму ня дзіва, што на прадпрыемствах шэйнікаў ёсьць выпадкі парушэньня гэтай дырэктывы. Такі-ж адказ павінны былі-б даць усе іншыя ЦП саюзаў, калі-б у іх было больш самакрытычнага падыходу да сваёй работы.

А. МАНЬКОЎ.

Адзінаначальле палепшыла работу

(Гапянтарэ ная ф-ка „Беларуска, Менск)

Са справай адзінаначальля на нашай фабрыцы раней было зусім дрэнна. Рабочыя майстроў ня слухалі, а усімі справамі па цэху хадзілі да дырэктара ці да фабкому. У самым «трыкутніку» таксама былі ня зусім добрыя ўзаемаадносіны.

Зараз справа адзінаначальля палепшылася. Пастанова ЦК УсеКП(б) была прапрацавана на сходзе майстроў і ўсяго тэхнічнага персаналу. Былі вызначаны абавязкі кожнага майстра, старшага па цэху і інш. Пытаньне аб адзінаначальлі таксама ставілася на партыйных сходах, а зараз ідзе прапрацоўка пастановы ЦК у цэхах.

Больш-менш добрая прапрацоўка пытаньня аб адзінаначальлі прынесла спрыяючыя вынікі. Зараз рабочыя з усімі пытаньнямі пахавага маштабу зварачаюцца выключна да майстроў, або старшых па цэхах. Усялякія заявы наконт работы падаюцца майстру і ўжо апошні, калі гэта патрэбна, перадае дырэктару.

Больш выразнай стала праца «трыкутніка». Партыйная ячэйка і фабком лепш пачалі кіраваць жыцьцём фабрыкі. Сацыяборніцтва мацнее. У кожным цэху—ударныя брыгады. Амаль кожны рабочы ведае пра прамфінплян свайго цэху і колькі ён павінен выпусьціць у дзень прадукцыі. Гэта ўсё дапамагло нам дабіцца перадовы ў рабоце фабрыкі. У лютым ф-ка дала на 47% больш прадукцыі, чым у студзені, і перавыканала вытворчую праграму на 8,5 проц.

Але самыя майстры часамі кенска адносяцца да прапаноў рабочых, не разумеўшы, як належыць, сваіх абавязкаў. Напрыклад, рабочы заўляе майстру Ільліну, што коли для шліфоўкі грабнёў саскаваліся і на іх нельга працаваць. Замест дзелавога адказу, майстар Ільлін нарабіў крыку і загадаў рабочым працаваць на папсаваных колах. Другі прыклад: рабочы Каплан аднойчы паказаў тэтаму-ж майстру, што грэбні, якія прынесены з мыечнага аддзяленьня, кепска прасартаваны. І зноў майстар Ільлін крыкнуў Каплану: «Я з табою не хачу гаварыць і зьнімаю цябе з работы». І зьняў Каплана з работы. Праўда, Каплан на другі-ж дзень быў адноўлены, але гэты факт кажа аб тым, што паасобныя майстры ня зусім добра зразумелі дырэктыву аб адзінаначальлі і ў некаторых выпадках перагінаюць палку.

Акрамя таго, патрабуючы ад рабочых прадпісыцыпліны, самі майстры не заўсёды паказваюць належны прыклад. У часе працы ідуць у буфэт або ў кантору, а ў цэху некаму прасачыць за ходам работы.

А. НЕБАГАТЫ.

Майстры баяцца адказнасьці

(Завод „Пралетары“, Гомель)

Майстры пэхаў заводу «Пралетары» ўхіляюцца ад правядзеньня ў жыцьцё пастановы ЦК УсеКП(б) аб адзінаначальлі. Яны баяцца асабістай адказнасьці, і ўсё тое, што яны праводзяць, раней узгадняюць з дырэктарам. Гэта датычыць таксама ўсякіх дробязяй, якія могуць быць вырашаны кожным майстрам.

Дрэнна зразумеў адзінаначальле і партыйны актыў. Гэта характарызуецца наступным выпадкам: калі ў такарным цэху назначылі новага майстра, цэхпартарганізатар адмовіўся яму падпарадкавацца. Зразумела, што такія «прыклады» робяць на рабочых вельмі адмоўны ўплыў.

Б. З.

Арганізацыйная блытаніна

(Лесазавод „Зьвязда“ Капцевічы)

На - лесапільна-фанэрным заводзе «Зьвязда» за апошнія тыдні значна зьмянцшылася прадукцыйнасьць. Норма вытвораўкі—84 прэсы ў суткі, выпускаецца-ж толькі 60-62 прэсы. Рабочыя працуюць з халадком. Працдысцыпліна ўпала. У адной зьмене 17-га лютага было 8 прагулаў па нягрунтоўных прычынах. У першай палове лютага было 18 выпадкаў парушэньня працдысцыпліны ў той час, як у студзені былі 2 выпадкі. Між тым, заводзкія арганізацыі ня прымаюць ніякіх мер. Усю барацьбу з парушэньнямі працдысцыпліны заводзкія арганізацыі ўскладаюць на адміністрацыю.

Праз некаторы час мяркуецца перавесьці завод на 7-гадзінны рабочы дзень, але належнай падрыхтоўкі да гэтага няма. Вакол пытаньняў рацыяналізацыі маса не мабілізуецца.

Усё гэта тлумачыцца тым, што на заводзе не праведзена дырэктыва аб адзінаначальлі. Адміністрацыйна-тэхнічны персанал і заводзкія арганізацыі не ведаюць дасканальна сваіх абавязкаў. Былі выпадкі, калі сакратар ячэйкі ўмешваўся ў працу адміністрацыі і па цэлым радзе пытаньняў падмяняў адміністрацыю. Заўком амаль нічога ня робіць, барацьба за працдысцыпліну яго ня цікавіць. Няма выразнасьці ў рабоце нізавога адміністрацыйнага персаналу. Былі выпадкі, калі распараджэньні старшых майстроў касаваліся маладшымі майстрамі. Прафактыў зусім не знаёмы з чарговымі задачамі партыі і прафсаюзаў.

Гэтыя арганізацыйныя недахопы і прывялі да таго, што завод зьнізіў прадукцыйнасьць працы і ня выконвае вытворчай праграмы.

Л.

Будаўніцтва не забясьпечана рабочай сілай

Калгасныя органы зрываюць адходніцтва сэзоньнікаў

Пытаньне аб забясьпячэньні сэзонных работ патрэбнай рабочай сілай зьяўляецца адной з галоўнейшых задач сёньняшняга дня.

Акруговымі інспэкцыямі працы ў найбольш буйныя калгасы БССР было накіравана 500 анкет для высьвятленьня лішкаў рабочай сілы. Анкеты былі накіраваны ў калгасы Магілеўшчыны, Бабруйшчыны, Мазыршчыны і Гомельшчыны, г. зн. у акругі, якія раней кожны год давалі найбольшую колькасьць рабочых-сэзоньнікаў.

У Наркампрацы зараз атрыманы адказы з 70-75 калгасаў Магілеўшчыны і Бабруйшчыны.

Гэтыя адказы сьведчаць аб тым, што ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ СЭЗОННЫХ РАБОТ НЕАБХОДНАЙ РАБОЧАЙ СІЛАЙ ЗНАХОДЗІЦЦА ПАД НАГРОЗАЙ ЗРЫВУ.

У Прапойскім раёне, Магілеўскай акругі, калгас, які аб'яднае 2.855 чал., адказвае ў анкеце, што лішкаў рабочых у калгасе няма. Камуна «Чырвоны Кастрычнік» тэй-жа акругі таксама адказвае, што з 2.075 чал. яна ня можа адпусьціць ніводнага чалавека на сэзонныя работы.

Такое становішча і такія-ж адказы паступаюць ад калгасаў іншых раёнаў Магілеўшчыны.

Адказы калгасаў Бабруйскае акругі таксама аднагалосна гавораць аб немагчымасьці адпусьціць калгасьнікаў на сэзонныя работы і аб адсутнасьці лішкаў рабочае сілы. Так адказваюць акругі, якія раней давалі найбольшую колькасьць адходнікаў. Гэтыя адказы гавораць аб тым, што калі ня будуць прыняты тэрміновыя меры, будаўнічы сэзон можа быць сарваны з-за адсутнасьці патрэбнай рабочай сілы.

Ніякай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў не вядзецца.

Адказы праўленьняў калгасаў сьведчыць аб тым, што яны зусім не азнаёміліся з дырэктывамі, якія даны Калгасцэнтрам па пытаньні аб падрыхтэўцы рабочай сілы для сэзонных работ. Большасьць калгасаў тлумачыць адсутнасьць лішкаў рабочых рук тым, што яны будуць заняты на будаўніцтве ў самых калгасах. Між тым, ДЫРЭКТЫВЫ КАЛГАСЦЭНТРУ ЯСНА ПАКАЗВАЮЦЬ, ШТО Ў ЧАСЕ СЭЗОННЫХ РАБОТ КАЛГАСЫ ПАВІННЫ ПРАВОДЗІЦЬ ВЫКЛЮЧНА НЕАДКЛАДНЫЯ І ТЭРМІНОВЫЯ РАБОТЫ.

Гэтыя адказы сьведчаць таксама аб тым, што КАЛГАСЫ ЯШЧЭ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЯ МАЮЦЬ ЦЬВЁРДЫХ ВЫТВОРЧЫХ ПЛЯНАЎ, ШТО ДА ГЭТАГА ЧАСУ ПРАЎЛЕНЬНІ КАЛГАСАЎ НЕ ПРЫСТУПІЛІ ДА ПРАВІЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ.

Сёлета на сэзонных работах павінна быць ня менш 200.000 адходнікаў-сэзоньнікаў. Асноўнай крыніцай патрэбнай рабочай сэзоннай сілы павінны стаць калгасы.

Праз два тыдні пачынаецца будаўнічы сэзон і іншыя сэзонныя работы. Трэба зараз-жа павесьці шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў. Акрыкалгассаюзы павінны ДАПАМАГЧЫ КАЛГАСАМ НАЛАДЗІЦЬ ПРАВІЛЬНУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ПРАЦЫ, ДАПАМАГЧЫ ВЫЯВІЦЬ ЛІШКІ РАБОЧАЕ СІЛЫ.

Партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі павінны паставіць сваёй задачай дабіцца поўнага забясьпячэньня сэзонных работ неабходнай рабочай сілай.

А—с.

Перавыбары саветаў адтэрмінаваны да сканчэньня веснавое сяўбы

У мэтах сканцэнтраваньня ўсяе ўвагі выканкомаў саветаў і савецкай грамадзкасьці на ажыцьцяўленьні задач веснавое пасеўнае кампаніі прэзыдыум ЦВК БССР пастанаўляе:

Адтэрмінаваць і перанесьці справаздачна-перавыбарчую кампанію саветаў на час пасьля сканчэньня веснавое пасеўнае кампаніі

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар ЦВК А. ХАЦКЕВІЧ

Перавыбраны 373 сельсаветы

Паводле вестак інфармацыйнага аддзелу ЦВК, на 17-га сакавіка па БССР перавыбраны 373 сельсаветы, што складае 29 проц. усіх сельсаветаў Беларусі.

На справаздачна-перавыбарчыя сходы зьявілася 63,3 проц. выбаршчыкаў, яўка жанчын—53,9 проц.

З ліку выбраных 21 з палов. проц. жанчын, камуністых—9,6 проц., камсамольцаў—7,2 проц., рабочых, сельгаспрабочых і батракоў—7,1 проц., сялян, вызваленых ад с.-г. падатку—47,4 проц., якія плацяць падатак бяз процантнай надбаўкі—39,7 проц., з процантнай надбаўкай—0,3 проц., іншых—5 з палов. проц., калгасьнікаў выбрана 72,9 проц.

На працягу 1930 г. ліквідаваць няпісьменнасьць працоўнага насельніцтва

Уводзіцца абавязковае навучаньне няпісьменных

Савет Народных Камісараў БССР унёс у ЦВК праект пастановы аб ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослага працоўнага насельніцтва. Пастановай прадугледжваецца, што ўсе няпісьменныя ад 12 да 45 год у вёсцы і ад 12 да 50 год у горадзе, не пазбаўленыя выбарчых правоў, павінны да 1-га мая 1930 г. зарэгістравацца ў сельскіх, месцачковых, або гарадзкіх саветах. На працягу 1930 году павінны ліквідаваць сваю няпісьменнасьць: рабочыя, батракі, с.-г. рабочыя, усе члены прафсаюзаў, дапрызыўнікі і перамеьнікі.

Няпісьменным рабочым, работніцам, батраком, батрачкам, калгасьнікам, хатнім работніцам павінна быць забясьпечана магчымасьць наведваць пункты ліквбезу. Прадпрыемствы і ўстановы абавязваюцца даваць свае памяшканьні з асьвятленьнем і апаламі для заняткаў з няпісьменнымі, якія працуюць у гэтых установах.

Да бясплатнае працы па ліквідацыі няпісьменнасьці прыцягваюцца ўсе асобы ад 18 да 50 год, не пазбаўленыя выбарчых правоў, якія маюць веды ў аб'ёме сямігодкі, або вясковай чатырохгодкі.

Асобы, якія ўхіляюцца ад рэгістрацыі, або ад ліквідацыі няпісьменнасьці, могуць быць абкладзены штрафам у разьмеры да 25 руб. Тыя, хто прыцягнуты да работы па ліквбезе, за ўхіленьне ад даручаных абавязкаў могуць быць аштрафаваны ў разьмеры да 50 руб., або прыцягвацца да прымусовых работ. Штрафы залічваюцца ў мясцовы бюджэт і выкарыстоўваюцца на ліквідацыю няпісьменнасьці.

Біржам працы прапануецца з 1-га студзеня патрабаваць ад тых, хто павінен ліквідаваць сваю няпісьменнасьць даведкі аб ліквідацыі няпісьменнасьці, або аб наведваньні школ ліквбезу. Пры пасылцы на работу, гэта будзе ўлічвацца.

Усе пісьменныя ад 18 да 50 год, пазбаўленыя выбарчых правоў, замест работы па ліквбезе, абкладаюцца спэцыяльным зборам.

У КАЛГАСАХ ЗАХОЎВАЮЦЦА САМАТУЖНЫЯ АРЦЕЛІ

Што пастанавіла сэсія Белсампрамсаюзу

Сэсія Белсампрамсаюзу, якая нядаўна скончылася, прыняла рад пастаноў аб поўнай перабудовы работы беларускай саматужна - прамысловай каапэрацыі, у адпаведнасьці з новымі задачамі, якія ўскладваюцца на саматужную каапэрацыю.

Адным з важнейшых пытаньняў, што абгаворваліся на сэсіі савету, было пытаньне **аб узаемаадносінах з калгасамі.** Сэсія дала наступную ўстаноўку.

У раёнах суцэльнае калектывізацыі, дзе саматужнікі—члены арцеляй—уступаюць у калгасы, у мэтах выканаьня вытворчых праграм, захоўваюцца саматужныя арцелі.

Частка прыбыткаў арцеляй ідзе ў непадзельны фонд калгасу. Вытворчыя пляны і кантрольныя лічбы ўзгадняюцца з праўленьнем калгасу. Праўленьні арцеляй узгадняюць з праўленьнямі калгасаў пытаньні прыёму новых членаў і рэгуляваньня зарплаты.

Шмат увагі было аддана пытаньню **б папяпшэньні абслугоўваньня попыту калгасаў.** Бярэцца курс на разьвіцьцё дрэваапрацоўчай саматужнай прамысловасьці. Значнае месца займе выраб цэглы і чарапіцы, пашыраецца смалакурная прамысловасьць — будуецца 70 новых катлоў.

Сэсія даручыла праўленьню да 1-га красавіка скончыць чыстку саматужна-прамысловай сыстэмы ад сацыяльна-чужых элемэнтаў, рашуча ўзмацніць работу з беднатой.

Значнае месца ў рабоце сэсіі заняла **праблема кадраў.** Сэсія прапанавала праўленьню БКС рашуча вылучаць нізавых працаўнікоў у кіруючыя органы саматужна прамысловай каапэрацыі. У бліжэйшыя дні Белсампрамсаюз адкрывае 3-месячныя курсы для падрыхтоўкі старшынь арцеляй на 50 чал. Кадры курсантаў будуць укамплектаваны за лік рабочых фабрык і заводаў. Згодна пастановы СНК, у БССР адкрываецца вячэрні тэхнікум саматужнай прамысловасьці.

М. Б.

БДТ-2—на новых шляхах

Беларускі 2-гі Дзяржаўны Тэатр прыязджае ў Менск другі раз. Сэзон 1927-28 году быў пераломным сэзонам для БДТ-2. Гэты сэзон тэатр пачаў працаваць са сваім старым студыйным рэпэртуарам. Справа ў тым, што яшчэ будучы студыяй пры МХТ, тэатр запазычыў ад МХТ, акрамя дадатных, галоўным чынам фармальна мастацкіх, якасьцяй і адмоўныя бакі. Адмоўным бокам зьяўлялася нясучаснасьць студыйнага рэпэртуару, які больш адпавядаў лёзунгу «Мастацтва для мастацтва».

Менскай савецкай грамадзкасьці выпала на долю зрабіць рашучы націск на тэатр, каб ён пайшоў па пралетарскіх рэйках, дзякуючы прынятым мерам з боку партыі і НКА, пачынаючы ўжо з паловы сэзону 1927-28 г., тэатр зрабіў рашучы паварот у бок сучаснасьці. На сёнешні дзень увесь стары рэпэртуар зьняты і заменены новым. У часе сваёй працы ў Менску БДТ-2 будзе карыстацца, такім чынам, толькі тым рэпэртуарам, што набыў за апошнія два гады. Побач са зьменаю рэпэртуару, узрастае і посьпех тэатру. Ужо ў сэзон 1928-29 г. у часе працы ў Гомелі і Магілеве паказы тэатру праходзілі з вялікім посьпехам. Шырокай хваляй у тэатр пайшоў арганізаваны працоўны глядач.

Пачатак гэтага сэзону, правільней большую палову сэзону, тэатр працаваў у Віцебску. У гэтай працы ён, праўда, сустрэў паўныя труднасьці. Адна з труд насьцяй—гэта перагрузка г. Віцебску тэатральнымі ўстановамі: акрамя БДТ-2 у Віцебску працаваў яшчэ цырк і гарадзкі тэатр.

Другая труднасьць—гэта адносна слабая яшчэ беларусізацыя прадпрыемстваў і ўстаноў.

Аднак, ня гледзячы на гэтыя труднасьці, тэатр працаваў з вялікім посьпехам. Было наладжана 97 паказаў. Пра пушчана праз тэатр 57.000 глядачоў. Асноўную групу глядачоў складаюць рабочыя. Гэта група перавышае ўсе іншыя разам узятыя. Арганізаваны працоўны глядач складаў 87 проц.

У Менску БДТ-2 мае працаваць канец гэтага сэзону і большую частку (магчыма ўвесь) наступнага. У канцы гэтага сэзону тэатр пасьпее паказаць ня больш 2-3 п'ес. Тэатр ставіць сваёй галоўнай задачай абслугоўваць арганізаванага глядача. Адкрытых паказаў будзе вельмі мала. У маі месяцы БДТ-2 выпусьціць прэм'еру «Авангард» В. Катаева.

Варта адзначыць, што перад БДТ-2 паўстае задача далейшага аднаўленьня свайго рэпэртуару. Хоць увесь рэпэртуар БДТ-2, былы студыйны, заменены сучасным рэвалюцыйным рэпэртуарам, але на сёнешні дзень некаторыя п'есы ўжо не зьяўляюцца досыць актуальнымі. Паколькі перад тэатрам стаіць задача адбіваць у сваёй працы сацыялістычнае будаўніцтва, зараз яму неабходны пастаноўкі на найбольш актуальныя тэмы гэтага будаўніцтва: пяцігодка, індустрыялізацыя краіны, сацпаборніцтва і г. д. Тэматычны плян гэтага сэзону не ўдалося выканаць таму, што сацыяльны заказ тэатру беларускім драматургам аказаўся невыкананым.

Ад менскіх прафсаюзных арганізацый тэатр чакае дапамогі па арганізацыі працоўнага глядача. Па прыкладзе Віцебску, тэатр мае на мэце арганізаваць рад вылазак на рабочыя прадпрыемствы для наладжаньня там лятучых канцэртаў-мітынгаў у часе абедзенага перапынку. Гэтай працы тэатр аддае вялікую ўвагу таму, што гэта зьяўляецца адной з форм сувязі тэатру з працоўным глядачом.

Д. Я.

МЕНСК

Усебеларуская канфэрэнцыя фізкультурнікаў

Учора працягваліся спрэчкі па дакладах т. т. Рыжова і Клімковіча. У спрэчках выступіла каля 60 дэлегатаў. На вячэрнім пасяджэньні з дакладам аб міжнародным спартыўным руху выступіў прадстаўнік УсеЦСПС тав. **Ешчын.**

Сёньня адбудуцца перавыбары бюро фізкультуры пры ЦСПСБ.

ЗА ДЗЕНЬ

— Прэзыдыум ЦВК БССР задаволіў просьбу тав. Раманчука аб аслабаненьні яго ад абавязкаў загадчыка музэю рэвалюцыі.

— **На 7 гадзін.** Прэзыдыум ЦП саюзу тэкстыльшчыкаў прызнаў патрэбным, каб у гэтым годзе былі пераведзены на 7-гадзінны рабочы дзень Якаўлевіцкая фабрыка і фабрыка «Дзьвіна»

З учарашняга дня перайшлі на 7-гадзінны рабочы дзень віцебскай чыгуначныя майстэрні.

— **Чыстка камгасу.** У бліжэйшым часе пачнецца чыстка апарату Менскага камгасу. Саюз камунальнікаў запрапанаваў мясцоваму калгасу шырока папулярызаваць задачы чысткі сярод рабочых і працоўных-наведвальнікаў камгасу. Да гэтае работы прыцягваецца «лёгкая кавалерыя».

Ільготы рабочым, якія пасылаюцца на работу ў сельсаветах

ЦВК і СНК БССР ухвалілі пастанову аб ільготах і забесьпячэньні рабочых, якія пасылаюцца ў вёску для работы ў сельскіх саветах.

Паводле гэтае пастановы, рабочым-членам гарадзкіх саветаў і рабочым, якія пасылаюцца ў вёску для ўзмацненьня сельскіх саветаў, калі гэта зьвязана з пераменаю месца пражываньня, выплачваецца кошт праезду і правозу маемасьці, а таксама сутачныя і адначасовая дапамога ім і членам іх сем'яў.

Калі зарплата рабочым у сельскім савеце будзе меншаю ад тае, якую яны атрымлівалі, дык ім даплачваецца розьніца на працягу аднаго году. Розьніцу аплачваюць гарсаветы і акрвыканкомы.

У разе павароту рабочых з вёскі, ім даецца права безадкладна паступіць на ранейшую работу, а калі гэтае работы няма, дык быць пасланымі на работу ў першую чаргу; па-за чаргою атрымаць ад мясцовага савету жыльлёвую плошчу для сябе і для членаў сям'і.

Члены сем'яў рабочых, якія засталіся на месцы, маюць права зарэгістравацца на біржы працы і атрымаць работу ў першую чаргу.

Чаму сарвана шэфства друкароў над акрфа

ЦП саюзу друкароў слаба цікавіцца пытаньнем арабочаньня апарату і пасылкі туды рабочых брыгад для азнаямленьня з работай установаў. Так, напрыклад, некалькі часу таму назад рабочыя друкарні «Зьвязды» вылучылі двух таварышоў, якім даручана было высьветліць у ЦП саюзу друкароў і ЦСПСБ пытаньне, якія установы прымацаваны да друкароў для шэфскае работы. Але гэтыя таварышы доўгі час ніяк не маглі даведацца ад ЦП саюзу друкароў, якія-ж фактычна ўстановы Менску зьяўляюцца нашымі падшэфнымі.

Урэшце выявілася, што да друкароў наогул прымацаваны дзьве ўстановы — НКФ і акрфа, а друкарня «Зьвязды» шэфствуе над Менакрфа. Пасьля гэтага фабзаўмясцком друкарні «Зьвязды» вылучыў рабочую брыгаду з 6 чал. для прымацаваньня да акрфа. Але шэфства друкароў над акрфа было зьнята. Гэта ўстанова прымацавана ўжо да іншага прадпрыемства. Дакларавалі прымацаваць да нас другую ўстанову, але час ідзе, а вылучаная брыгада знаходзіцца без работы, бо няма прымацаванае ўстановы.

М. Д—н.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛР КОРАЎ

РАЗБАЗАРВАЮЦЬ НАСЕННУЮ БУЛЬБУ

У Чырвона-Бярэскім сельсавеце (Бабруйшчына) сяляне разбазарваюць насенную бульбу, кормяць ёю жывёлу. А ў калгасах амаль нічога ня зроблена, каб арганізаваць насенны бульбяны фонд. Сельсавет не вядзе ніякай барацьбы са зьнішчэньнем насеннае бульбы.

О. Л.

СПАБОРНІЦТВА ПАЛЕПШЫЛА ПРАЦОЎНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ

Сьлесары, занятыя на будаўніцтве Крычаўскага фасфарытнага заводу, абвясьцілі сябе ўдарнымі і пастанавілі ўсё зрабіць, каб пусьціць млын да пачатку веснавое сяўбы. Сьлесары выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва цесьляроў і каменшчыкаў. Апошнія выклік прынялі. Пасьля падпісаньня дагавору аб сацыялістычным спаборніцтве на будаўніцтве палепшылася працоўная дысцыпліна.

Рубека.

АБАГУЛЬВАЮЦЬ ІНВЭНТАР І ЦЯГАВУЮ СІЛУ

Па Крынкаўскім сельсавеце, Высачанскага раёну, калектывізавана 350 гаспадарак з 555. Зараз праводзіцца абагуленьне інвэнтару і цягавай сілы. У калгасе «Новае Жыцьцё» ўжо абагулен увесь інвэнтар і коні. Гэта работа праведзена пры актыўным удзеле рабочых—брыгадзіраў віцебскай фабрыкі «Дзьвіна».

Брыгадзір.

20-га сакавіка, у 19 гадз., у памяшканьні АК КП(б)Б адбудзецца агульна - гарадзкая нарада ўсіх партупаўнаважаных «Правды» г. Менску з наступным парадкам дня: 1. Вынікі сац. спаборніцтва па «Правде», 2. Аб месячніку па «Правде» ў зьвязку з XVI партзьездам.

Усе партупаўнаважаныя пад асабістую адказнасьць сакратароў ячэек павінны зьявіцца на нараду без спазьненьня.

21 сакавіка, у 19 гадз., у залі акругкому КП(б)Б (3-ці паверх) Фрунзаўскі РК КП(б)Б склікае нараду з наступным парадкам дня:

1. Даклады з месц апоргаў ячэек аб ахапленьні ленінскага набору партвучобаю і аб ходзе вучобы з ленінскім наборам. 2. Аб вярбоўцы ў вайсковыя школы. 3. Аб масавым вечары Асоавіяхіму.

На нараду ў абавязковым парадку павінны зьявіцца ўсе апоргі вытворчых ячэек і ваенорг ячэек.

24-га сакавіка, у 19 гадз., у **Доме Камасьветы** Фрунзаўскі РК КП(б)Б склікае раённы сход ленінскага набору 1930 г. з наступным парадкам дня: даклад аб чарговых задачах партыі, рабочае клясы ў выкананьні пяцігодкі і аб партыхаваньні.

На нараду запрашаюцца ўсе таварышы, якія ўступілі ў партыю ў ленінскія дні 1930 г., а таксама апоргі партыйных і камсамольскіх ячэек.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

20-га сакавіка, у 18 гадзін, у Доме Камасьветы склікаецца НАРАДА-ВЕЧАР вылучэнцаў Фрунзаўскага раёну з удзелам кіраўнікоў установаў і прадстаўнікоў рабочых заводу, з якога былі вылучаны гэтыя таварышы.

Парадак дня: 1. Задачы работы з вылучэнцамі і 2. Даклады вылучэнцаў з месц.

СЕНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 19 гадз. (пакой № 19) групавая кансультацыя для прапагандыстых ВСПШ—«Палітыка партыі ў галіне працы».

— У 19 гадз. (пакой № 3) — заняткі гуртка ангельскае мовы.

Дом Пісьменьніка. У 19 гадз. адбудзецца сход фракцыі КП(б)Б БелАПП'у.

Дэкадны Камвуз. Чарговыя заняткі на эканамічным цыклі—у 18 гадз. (лектар тав. **Будзінскі**), на гістарычным — 18 гадз. (лектар тав. **Будкевіч**) і на філёзофскім — 19 гадз. (лектар тав. **Вайнштэйн**).

Дом Асьветы. У 19 гадз. — агульна-гарадзкі сход асьветнікаў. На парадку дня даклад аб Парыскай Камуне і міжнародным становішчы. Яўка асьвет. абавязкова.

БДУ. У 19 гадз. у аўд. 4 прыродазнаўчага корпусу№пасяджэньне асьпір. гіст. сэмінару. Даклад тав. **Дудкова** — «Сталыпінская рэформа ў Віцебск. губ.».

Клюб навукоў. працаўнікоў. У 20 гадз. агульны сход мэдычнай сэкцыі Белтарнітса.

— У 21 гадз. пасяджэньне прыймовай камісіі Белтарнітса.

— Пры клюбе стала два разы ў месяц будзе выходзіць фотахроніка СНП. Просьба да ўсіх навукоўных працаўнікоў здаваць здымкі, або малюнкі аб недахопах і дасягненьнях з жыцьця навуковых працаўнікоў і ўстаноў у канцэлярыю клюбу.

ЗАЎТРА

Дом Камасьветы. У 19 гадз даклад для парт. і камс. актыву на тэму: «Калгаснае будаўніцтва і задачы арганізацыі працы і вытворчасьці ў калгасах». Пасьля дакладу кінофільм. Білеты на РК КП(б)Б і КСМБ.

Дом Пісьменьніка (Савецкая, 68). Агульна - гарадзкая нарада ўпоўнаважаных «Комсомольской Правде» г. Менску з наст. парад. дня: 1) Вынікі сацспаборніцтва па «Комсомольской Правде», 2) Аб месячніку па «Комс. Правде» ў зьвязку з 5-годзьдзем існаваньня газэты (юбілей). Усе ўпоўнаважаныя пад асабістую адказнасьць сакратароў ячэек павінны зьявіцца на нараду без спазьненьня.

Мэдсэкцыя нав. т-ва БДУ. У 20½ гадз. у аўдыторыі судова - мэдычнай экспэртызы (анатамічны корпус, 2-гі паверх —БДУ) адбудзецца даклад лацэнта В. Ф. Чарвакова на тэму: — Аб маніфах з дэманстрацыяй апошніх. Апрача дактароў, запрашаюцца рабочыя заводу «Энэргія» і інш. прадпр.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

20-га сакавіка г.-т. у памяшканьні Дому Асьветы (Камуністычная вул.)
— СКЛІКАЕЦЦА —
нарада загадчыкаў Культсэктароў саюзаў і старшынь культ-груп альбо культкамісій фабзаўмясцкомаў
— ПАРАДАК ДНЯ —
Даклад дырэктара Бел. 2-га Дзяржаўнага Тэатру Я. Лімановускага аб працы тэатру ў Менску і абслугоўваньне працоўных гледачоў.
Прысутнасьць абавязкова.
Пачатак роўна а 7-ай гадзіне
Культсэктар ЦСПСБ

У чацьвер, 20 сакавіка а 8 гадз. увечары
ў памяшканьні клюбу Саўгандальслужачых
— АДБУДЗЕЦЦА —
СХОД усіх работнікаў Цэнтральнага апарату МЦРК і работнікаў прылаўку
сумесна з рабочымі абутковай фабрыкі.
— Парадак дня —
1. Даклад аб рабоце ЦРК за 1928-29 год.
2. Даклад РСІ аб чыстцы апарату ЦРК.

У СЕРАДУ 19 сакавіка
Клюб ДРУКАРОЎ
ВЫКЛЮЧНА МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
— з удзелам —
СЛАВУТАГА КІНО-АРТЫСТАГА
— ДУГЛАСА ФЭРБЭНКСА —
— у фільме —
Тры мушкацеры
—) у 12 частках (—
2 СЭРЫІ—У АДЗІН СЭАНС
Цэны мясцом—20 кап.)—(Пачатак 1-га сэансу—7 г. увеч. » 2-га » 9 г. »
Білеты ў касе клюбу з 5 гадзін.
ЯШЧЭ 1 раз

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
А. КАЗАКОЎ Пытаньні кіраўніцтва, арганізацыі і аплаты працы ў калгасах. Стар. 77. Цана 20 к.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску
Субота, 22-га сакавіка
АДКРЫЦЬЦЁ СЭЗОНУ БДТ—2 У МЕНСКУ
Б. ЛАЎРЭНЕЎ
РАЗЛОМ
п'еса ў 4-х дзеях.
Пастаноўка Сяргея Разанава. Музыка Паловінкіна.
Мастак Ю. Гольц. Дырыжэр Ільля Гіттэрц.
Хармайстр М. Кауфман.
Уваход па запрашальных білетах.
Рэшта білетаў на 22-III прадаецца толькі ў рабочай касе.
Пачатак роўна а 7 гадз.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
СЕНЬНЯ і ШТОДЗЕННА
„ХИЖИНА дяди ТОМА"
Замежная кіно-п'еса ў 6 част.
ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ: а 1 г. дня і 3 г. 15 м.
Каса—ад 12 г. дня.
ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ: а 7 г., 8 г. 45 м і 10 г. 30 м.
Каса—ад 5 г. увеч.
КІНО Інтэрнацыянал
2-гі тыдзень пастаноўкі 2-гі
Замежны мастацкі фільм
ЧАЛАВЕК АГНЮ
ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ: а 1 г. дня, 2 г. 30 м., 4 г.
ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ:
а 6 гадз., 7 гадз. 30 м., 9 гадз. і 10 гадз. 30 м.
Каса—ад 12 гадз. дня.
КІНО Пралетарый
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ЛЕДЗЯНЫ ЛЁС
Драма ў 6 частках.
Пачатак сэансаў: а 6 гадз. 30 м., 7 г. 50 м., 9 гадз. 10 м. і 10 гадз. 30 м.
КАСА адкрыта ад 5 гадз.
1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
Гістарычная кіно-аповесьць
СЫН РЫБАКА
(М. В. Ламаносаў)—(у 7 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз., 2-га—2 г. 30 м і 3-га—4 гадз.
Каса адчынена ад 11 г. 30 м.
КІНО СПАРТАК
Новы мастацкі фільм. Сумесная вытворчасьць „Межрабпом-фільм" і „Прометэяус" (Нямеч.)
Паводле драмы Л. Талстога
ЖЫВЫ ТРУП драма ў 7 частках
У галоўн. ролях: НАТА ВАЧНАДЗЕ і В. ПУДОЎКІН
Пачатак 1 с. а 7 г. Каса—ад 5 г. 30 м.

ОТКРЫТ ПРИЕМ на ЗАОЧН. ФОТО- и КИНО-КУРСЫ
Ф. К. С. К.
(Общество друзей советской кинематографии)
ПО ОТДЕЛЕНИЯМ:
ФОТО отделение
КИНО механиков-передвижников
КИНО-сценаристов
КИНО механиков ст. цион. установок
Слушатель может быть зачислен в идущую группу или вновь начинающую. Стоимость обучения за весь курс по отделениям:
1) фото-отделение . . . . . 15 руб.
2) кино-механиков передвижников . 15 руб.
3) кино-механиков стационарников . 18 руб.
4) кино-сценаристов . . . . 20 руб.
Подробные сведения даны в проспекте, который высылается по первому требованию за 10-коп. марку. Все запросы и деньги нужно посылать по адресу: Издательство „Техникопечать", Москва, 9, Страстной бул. 2/47 Отдел Заочных Курсов № 83.

ЮДА || ЮДА || ЮДА

ТАРФЯНАЯ БІБЛІЯТЭКА
Х. БАЖЦЕЎ.
ТОРФ і ЯГО СКАРЫСТАНЬНЕ—
кароткая энцыклёпэдыя ўжываньня торфу.
ЗЬМЕСТ—Каштоўныя для практыкі фізычныя і хімічныя ўласьцівасьці торфу.
Магчымасьць шырокага скарыстаньня торфу ў народнай гаспадарцы.
Торф у прамысловасьці БССР.
Торф на транспарце.
Торф у будаўнічай справе.
Торф у сельскай гаспадарцы.
Торф у мэдыцыне і санітарыі.
Торф у вайсковай справе.
Стар. 75. Цана 25 кап.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

Беларуская Дзяржаўная Акадэмія сельскае гаспадаркі
АДБЯШЧАЕ,
што ёю праводзіцца ўвесну прыём студэнтаў на наступныя факультэты:
а) арганізацыі і эканомікі буйное сельскае гаспадаркі . . . 24 асобы,
б) факультэт расьлінаводзтва . 26 асоб,
в) факультэт жывёлагадоўлі . 25 асоб,
Усяго ў парадку вольнага прыёму . . . 75 асоб.
Прыём заяў будзе праводзіцца з **10-га сакавіка па 25-га сакавіка.**
Да заяў павінны быць прыложаны наступныя дакументы:
1) Анкета, засьведчаная мясцовай арганізацыяй ці ўстановай. 2) Аб адукацыі. 3) Мэтрыка. 4) Аб матар'яльным становішчы бацькоў да рэвалюцыі і пасьля і не пазбаўленьні выбарчых правоў. 5) Аб адносінах да вайсковай павіннасьці (копія). 6) Аб стане здароўя. 7) Тры фота-карткі. 8) Водзыў аб працы—грамадзкай і на вытворчасьці і марак паштовых на 20 кап.
Іспыты будуць праводзіцца па праграме за курс рабфака **з 25-III па 1-IV г. г.**
Ад іспытаў вызваляюцца скончыўшыя рабфакі, тэхнікумы і курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ.
Расклад месц па сацыяльных групах устанаўляецца: на менш 90 проц. рабочых, батракоў і беднякоў-калгасьнікаў, астатнія месцы прадастаўляюцца тым сацыяльным катэгорыям, якія маюць права на паступленьне ў ВНУ.
Рэктар Акадэміі П. І. ПІНЧУК.

24 САКАВІКА г. г. адбудзецца
датэрміновы выпуск
КААПЭРАЦЫЙНАГА ТЭХНІКУМУ.
Запрашаюцца таварышы, скончыўшыя у розны час тэхнікум, на ўрачысты вечар, для абгаварэньня раду пытаньняў працы скончыўшых і аб рэарганізацыі тэхнікуму.
КАМІСІЯ.

ДА УВАГІ дзяржустаноў, фота-аматараў, працколектываў, арцеляй і саматужнікаў.
ЦЭНЫ ЗНІЖАНЫ
ФОТО-КІНО
МАГАЗЫН
БЕЛДЗЯРЖКІНО
Ленінская, 7.
З 10 сакавіка ЦЭНЫ на фота-паперу, пласьцінкі, адкрыткі, кіно-ўстаноўкі і кіно-часткі
ЗНІЖАНЫ ад 5 да 10%
Магазын КУПЛЯЕ і ПРАДАЕ карыстаныя фота-апараты і фота-прылады.
БЕЛДЗЯРЖКІНО.

Даводзім да ведама ўсіх грамадзян,
ШТО ДАПЛАТНЫЯ ЛІСТЫ,
якія пасылаюцца па адрасе—Менск, бюро падпіскі „Кніга поштай" БДВ, Ленінская, 19—
выкупляцца ня будуць.
Бюро падпіскі „Кніга Поштай".

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДСКОЙ УЗЕЛЕЖАНАЙ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Савэтаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўнікіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзенна
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях на папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

Кіраўніцтва трэсту „ЛЕСБЕЛ"
гэтым паведамляе свою кліентуру, што
з 15 сакавіка г. г. рэалізацыя ўсёй прадукцыі
як на Беларускім рынку, так і на ўсіх іншых рынках Саюзу
перадана поўнасьцю САЮЗЛЕСУ (быўш. Лесасындыкату)
У сувязі з гэтым камэрцыйны аддзел Лесбелу рэарганізуецца і ўсе дагаворы і ўмовы, што дзейнічаюць, пераданы для выкананьня УСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ САЮЗЛЕСУ (Менск, готэль «ЭЎРОПА», № 26, тэлефон № 14-29).
Па ўсіх пытаньнях і спраўках камэрцыйнага характару (куплі, прыём, адгрузка розных матар'ялаў, выкананьне нарадаў) належыць у далейшым зьвяртацца
выключна ва Ўсебеларускую Кантору Саюзлесу,
куды такэма мэханічна, без усякага прагляду і паведамленьня аб гэтым адрасатаў будзе надалей перадавацца паступаючая ў лесбел карэспандэнцыя па ўсіх вышэйпаказаных пытаньнях.
ЛЕСБЕЛ

АГЕНТЫ по подписным изданиям, опытные, в любом месте БЕЛОРУССИИ
приглашаются для работы на процентах.
Письменные предложения с кратким указанием стажа подписной работы адресовать: Москва, 6, Цветной бульвар, 25—Художественному Издательству Акц. Об-ву АХР.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Даведка аб выбарч. правох Гольдзберг Б. З., выд. Мен. міліцыяй. 478

Даведка аб працы Мельцэра Л. А., выд. Мен. Камгасам. 479

Парт. біл. № 1106327 Лапіцкага Ў. Р., выд. Аршанск. АК КП(б)Б 480

Прац. сьпіс і даведка аб працы Мядзьведзевай К., выд. Омск. кандукт. рэвэр. 481

Лен. кн. Зелікавай Р. Э., выд. Мен. страхкасай. 482

Пашпарт Алесіёнак А. І., выд. Мен. міліцыяй. 483

Пасьведч. аб камандыроўцы на курсы пекароў Рэзьніка З. Э., выд. Калінін. спаж. т-вам. 484

Вайск. кн. Грамовіча А. Н., выд. Мен. ваенкаматам. 485

Даведка аб працы Грамовіча А. Н., выд. праўл. МБВ ч. 486

Вайск. пасьведч Баляноўскага Ў. Я., выд. Мен. ваенкаматам. 487

Вайск. біл. Гуліда В. М., выд. Мен. ваенкам. 488

Патэнт на 1929-30 год Шэйнгауза Е. Л., выд. Мен. Акраф. 489

Пасьведч. Залуцкага І. В., выд. Мен. аб'ядн. прафтэхшколай. 490

Пасьведч. № 1490 Барташэвіча А. Б., выд. Менакрмалжыўёлсаюзам. 491

Асабов. кн., вуч.-конск. кн., выд. Мен. ваенкаматам на імя Дубоўскага К. Р. 492-493

Дагавор на пабудову дому і плян дому Зубчэнка І. І., выд. Мен. Камгасам. 494

Біржа. талён Раўтовіча А. Г., выд. Мен. біржай працы. 495

Даведка аб працы Скварноўскага І. Ф., выд. універсыт. гарадком. 496

Пасьведч. № 116/45 Нечай З. Н., выд. Мен. акрана аб скончэньні 2-й вячэрняй школы павыш. тыпу. 497

Вуч.-конск. кн. Кісьляровіча О. І., выд. Мен. ваенкаматам. 498

Дравян. кн. № 4/с Сазонава М. Г., выд. Ленін. к-рай № 2 МБВ ч. 499

Пасьведч. (наш.), выд. Уэльвенскім РВК, вуч.-конск. кн. на імя Вулка П. А. 500-501

Пэнс. кн. № 1523 Міхайлоўскай І. Ф., выд. Віцебск. страхкасай. 502

Вайск. кн. Сінкевіча М. І., выд. Мен. ваенкаматам.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Гапоўцтвел № 337.